Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МККП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№ 279 (5953) | 5 снежня 1937 г., нядзеля | ЦАНА 10 КАП.

СЁННЯ ВЯЛІКАЕ ЎСЕНАРОДНАЕ СВЯТА—ГАДАВІНА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ СТАЛІНСКАЙ КАНСТЫТУЦЫІ.

ШЧАСЛІВЫЯ НАРОДЫ КРАІНЫ СОВЕТАЎ, ПАД СЦЯГАМ СТАЛІНСКАЙ КАНСТЫТУЦЫІ, ПАД КІРАЎНІЦТВАМ ПАРТЫІ ЛЕНІНА—СТАЛІНА ІДУЦЬ ДА НОВЫХ ПЕРАМОГ СОЦЫЯЛІЗМА.

ЎСЕНАРОДНАЕ СВЯТА

Сёння многамільённы шчаслівы совецкі народ святкуе найвялікшую галавіну — дзень зацвярджэння новай Сталінскай Канстытуцыі. 25 лістапада 1936 года вялікі праздыр працоўных усяго света таварыш Сталін, заканчваючы свой гістарычны даклад на Надзвычайным VIII Усесаюзным З'ездзе Советаў, гаварыў:

«Праз некалькі дзён Совецкі Саюз будзе мець новую, соцыялістычную Канстытуцыю, пабудаваную на асновах разгорнутага соцыялістычнага дэмакратызма.

Гэта будзе гістарычны дакумент, які трактуе проста і спісла, амаль у пратакольным стылі, аб фактах перамогі соцыялізма ў СССР, аб фактах выязлення працоўных СССР ад капіталістычнага рабства, аб фактах перамогі ў СССР разгорнутай, да канца паслядоўнай дэмакратыі.

Гэта будзе дакумент, які сведчыць аб тым, што тое, аб чым марылі і прадаўжаюць марыць мільёны чэсных людзей у капіталістычных краінах, — ужо ажыццёўлена ў СССР. (Бурныя апладысменты).

Гэта будзе дакумент, які сведчыць аб тым, што тое, што ажыццёўлена ў СССР, цалкам можа быць ажыццёўлена і ў іншых краінах. (Бурныя апладысменты)».

5 снежня 1936 года краіна атрымала гэты геніяльны сталінскі дакумент, адкрыўшы новую эру ў жыцці чалавецтва. З'езд Советаў, упаўнаважаны ўсім 170-мільённым народам, заканцердзіў самую зыдатную, самую дэмакратычную ў свеце Канстытуцыю. Яркай зяздой загарэлася яна над нашай свабоднай квітнеючай радзімай. Не было прадзелаў народнаму ліканню. У Маскве і Казані, у Ленінградзе і Менску, у Кіеве і Ташкенце у Архангельску і Тбілісі, у Владзівастоку і Баку— за ўсіх кутках неасяжнай соцыялістычнай дзяржавы працоўныя дэманстравалі сваю глыбокую і беззаветную любоў і адданасць большэвіцкай партыі Леніна—Сталіна, славілі імя вялікага творца Канстытуцыі соцыялізма. Імя Сталіна з пачуццём безмежнай удзячнасці называлася на ўсіх мовах народаў СССР, для якіх новая Канстытуцыя навекі ўзаконіла права на шчасце, на радасць.

Сталінская Канстытуцыя — гэта ітог вялікай барацьбы і вялікіх перамог рабочых і сялян нашай краіны, якія 20 год таму назад пад геніяльным кіраўніцтвам партыі Леніна—Сталіна, назаўсёды вызваліліся ад капіталістычнай эксплаатацыі і ва ўпартай найжарэйшай барацьбе з ворагамі партыі і народа, пабудавалі вялічны будынак соцыялізма, упэўнена і паспяхова ідуць па шляху да комунізма.

Шляхаводнай зяздой з'яўляецца Сталінская Канстытуцыя для працоўных капіталістычных краін, для ўсіх прыгнечаных людзей света. Яна служыць ім праграмай дзеянняў, светлым маяком у барацьбе з памешчыцка-капіталістычным ладам, з усімі эксплаататарамі. Працоўныя капіталістычнага света ведаюць цяпер ясна, за што яны змагаюцца, да чаго імкнуцца. Яны хочуць тых-жа сапраўдных свабод, тых-жа сапраўдных гарантаваных вялікіх правоў, якія атрымалі народы Совецкага Саюза па Сталінскай Канстытуцыі.

Але такія свабоды, такія правы, такая сапраўдная народная дэмакратыя немыслімы там, дзе пануе капіталізм. І працоўныя капіталістычных краін ведаюць цяпер, як трэба змагацца за сваё вызваленне, за сваю свабоду. «Цяпер, калі мутная хваля фашызма аплёўвае соцыялістычны рух рабочага класа і змешвае з грязёй дэмакратычныя імкненні лепшых людзей цывілізаванага света, новая Канстытуцыя СССР будзе абвінавачым актам супроць фашызма, гаворачым аб тым, што соцыялізм і дэмакратыя непераможны. (Апладысменты). Новая Канстытуцыя СССР будзе маральнай дапамогай і рэальнай падмогай для ўсіх тых, хто вядзе цяпер барацьбу супроць фашысцкага варварства». (З даклада таварыша Сталіна аб праекце Канстытуцыі СССР).

Няма больш у свеце такога шчаслівага народа, як народ вялікага Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік! Няма больш у свеце такой краіны, дзе так вольна дыша чалавек, як наша цудоўная соцыялістычная радзіма! Няма большага шчасця, чым быць членам вялікай сям'і народаў СССР, насіць гордае званне грамадзяніна Совецкага Саюза! Бо няма нідзе такіх велічных свабод, такіх велізарных правоў, якія мае кожны грамадзянін нашай вылатнай соцыялістычнай радзімы. Там, у свеце загніваючага капіталізма, у краінах, дзе пануе варварскі фашызм — дзесяткі мільёнаў беспрацоўных, асуджаных разам са сваімі сем'ямі на безвыходную галечу, голад і холад. У нас, у свабоднай краіне Советаў, кожны грамадзянін карыстаецца правам на атрыманне гарантаванай работы, правам на адпачынак, радасны, культурны, вясёлы адпачынак. Там — усё большае і большае скарачэнне выдаткаў на народную асвету, закрываюцца школы як пачатковыя, так і сярэднія, універсітэты. У нас — усеагульнае абавязковае навучанне, няўхільны рост колькасці школ, сярэдніх і вышэйшых навучальных устаноў; кожнаму грамадзяніну забяспечана магчымасць поўнасцю выкарыстаць сваё права на асвету Там — старыкі і інваліды, не здолеўшыя накапіць неабходныя сродкі для існавання, асуджаны на галодную смерць

У нас кожны грамадзянін карыстаецца правам на матэрыяльнае забеспячэнне ў старасці, у выпадку хваробы і страты працаздольнасці. Там—няроўнасць полаў, прыгнечанне чалавечай асобы, удушэнне творчай мыслі і ініцыятывы. У нас—поўнае роўнапраўе жанчын з мужчынамі, велізарныя магчымасці шырокага і свабоднага развіцця творчых сіл, энергіі і здольнасцей кожнага грамадзяніна. Там — няроўнасць нацый, панаванне гнусных расавых тэорый, шалёнае ўкаванне і праследванне нацыянальных меншасцей. У нас — вялікая, моцная і непахісная дружба народаў.

Вось чаму так палка гараць пачуцці совецкага патрыятызма ў нашай краіне, вось чаму працоўныя так горача любяць сваю радзіму, так бязмежна адданы большэвіцкай партыі, совецкай уладзе, вялікаму Сталіну. Вось чаму ў нашай краіне з кожным днём, з кожнай гадзінай растуць рады стаханаўцаў прамысловасці і транспарту, соцыялістычнага земляробства і жывёлагадоўлі, рады герояў соцыялістычнай бухоўлі, герояў-пагранічнікаў, ударнікаў баявой і палітычнай падрыхтоўкі ў Чырвонай Арміі. Кожны чэсны грамадзянін Совецкага Саюза — патрыёт сваёй соцыялістычнай радзімы — гарыць адзінай мыслю, адзіным імкненнем — зрабіць магчыма больш і лепш для сваёй краіны, для свайго народа.

Глыбокім прэзрэннем і ненавісцю перапоўнены сэрцы працоўных БССР, як і ўсіх працоўных Совецкага Саюза, да злейшых ворагаў народа — трацкісцка-бухарынскіх агентаў германа-японскага і польскага фашызма, якія складалі подлыя, здрадніцкія планы рэстаўрацыі капіталізма ў СССР, арганізоўвалі шкодніцтва, дыверсіі і шпіянаж, рыхтавалі інтэрвенцыю супроць Совецкага Саюза. Пралічыліся ворагі! Іх разграміла жалезная рука слаўных чэкістаў, узначальваемых сталінскім наркомам Нікалаем Іванавічам Ежовым.

З горда ўзнятай галавой, шчаслівы і радасны, з імем Сталіна на вуснах, падыходзіць совецкі народ да гістарычнай даты — 12 снежня — дня самых дэмакратычнейшых выбараў у Вярхоўны Совет СССР па Сталінскай Канстытуцыі. У гэты дзень увесь народ прыйдзе да выбарчых урнаў, каб галасаваць за творца выдатнай Канстытуцыі вялікага Сталіна, за яго слаўных саратнікаў, за верных, лепшых сыноў соцыялістычнай радзімы.

Велізарнае шчасце і радасць працоўных Менскай гарадской выбарчай акругі, якім выпаў гонар галасаваць за бліжайшага саратніка вялікага Сталіна, жалезнага наркома абароны, першага маршала Совецкага Саюза Клімента Ефрамавіча Варашылава. Гэтай кандыдатурай ганарацца працоўныя сталіцы БССР, ганарыцца ўвесь беларускі народ.

На шматлікіх перадвыбарчых мітынгах і сходах, у прамовах слаўных кандыдатаў у дэпутаты Вярхоўнага Совета ад беларускага народа, у прамовах і рэзалюцыях выбарчыкаў гучаць, як вясенняя радасныя песні, расказы аб новым, шчаслівым жыцці, аб росце заможнасці, культуры і багацці. І як урачыстая клятва, гучаць словы працоўных БССР — совецкіх патрыётаў — аб тым, што ў любую мінуту, па першаму закліку партыі, па першаму закліку свайго слаўнага кандыдата ў дэпутаты Вярхоўнага Совета К. Е. Варашылава, яны гатовы выступіць на абарону сваёй радзімы, знішчыць ворага там, адкуль ён асмеліцца напасці на нас. Працоўныя БССР, увесь совецкі народ, стварыўшы такую слаўную Чырвоную Армію, маючы такіх самаадданых, адважных пагранічнікаў, маючы мільёны гарачых патрыётаў радзімы, поўным голасам заяўляюць на ўвесь свет:

— Краіна Сталінскай Канстытуцыі, краіна соцыялізма непераможна!!

ЗАСЫПКА НАСЕННЫХ ФОНДАЎ ПА КАЛГАСАХ БССР

Паводле вестак Наркамзема Беларусі на 30 лістапада па калгасах БССР план засыпкі насенных фондаў па збожжавых выканан на 57 проц. (было на 25 лістапада 31 проц.), у тым ліку — яравой пшаніцы засыпана 64 проц., аўса — 50 проц., ячменю — 65 проц.

План засыпкі ільнанасення выканан на 84 проц., канопляў — 59 проц. Пад пагрозу зрыву пастаўлен план засыпкі насення траў: па канюшыне засыпана 7 проц., віка на зярно і на сена—9 проц

Толькі 2 раёны — Лоеўскі і Петрыкаўскі — поўнасцю выканалі план засыпкі збожжавых яравых. Разам з гэтым ёсць значная група раёнаў, якая гаснебна марудзіць з засыпкай. У першую чаргу гэта адносіцца да Клічаўскага, Суражскага, Менскага, Мсціслаўскага, Смілавіцкага, Уваравіцкага, Чэрвеньскага, Чэрыкаўскага і Копыльскага раёнаў, дзе план засыпкі збожжавых зрываецца.

План засыпкі ільнанасення выканан толькі 21 раёнам рэспублікі. Ёсць значная група раёнаў, якая засыпку ільнанасення вядзе больш чым хрэнна. Гэта — Клічаўскі, Суражскі, Чэрвеньскі, Чачэрскі, Уваравіцкі, Смілавіцкі, Пухавіцкі, Менскі, Мсціслаўскі і Бабруйскі раёны. У названых раёнах план засыпкі ільнанасення выканан менш чым напалову.

Зварачае на сябе асаблівую ўвагу непярпімае адставанне рэспублікі па ачыстцы засыпанага насення. Прапушчана збожжавых праз трыер толькі 11 проц. засыпанага. Прырост за апошнюю пяцідзённку складае... 1 проц.

СТАЛІНСКАЯ ДЭКАДА СТАХАНАЎСКІХ РЭКОРДАЎ

ПАДРЫХТОЎКУ ДА ВЫБАРАЎ У ВЯРХОЎНЫ СОВЕТ СССР СТАХАНАЎЦЫ АЗНАМЯНОЎВАЮЦЬ НОВЫМІ РЭКОРДАМІ ПРАДУКЦЫЙНАСЦІ ПРАЦЫ

ДЗЕНЬ КАНСТЫТУЦЫІ

Дзень Канстытуцыі сягоння, —
Вялікі дзень, святочны дзень!
Народ, што быў вякі ў прыгоне,
І блукаў без пуцця, як цень, —
Ён вольны гаспадар сягоння.

Смяюцца з сонцам побач людзі,
А сонца—госць штодзённы іх,
Бо што было, ўжо больш не будзе. —
Ні марных сноў, ні бед ліхіх...
Шчаслівыя вы, нашы людзі!

Ідзе па бельм сзеце слава,
Шуміць разбуджаны прастор,
І над Совецкаю Дзяржавай
Ясней яснее чырвань зор,
Каб больш расла йшчэ наша слава.

Ідзе жыццё чароўнай казкай,
Душу абвіў пулоўны чар,
На свет глядзяць э вясёлай ласкай
Дзяўчына, хлопец, мал і стар.
Бо стала явай, праўдай казка.

Іграй, музыка, гулка, громка,
Дзяўчына, песні нам спявай!
Не пойдзе жабразань з хатомкай,
Як некалі, наш родны край.
Спявайце-ж, грайце гулка, громка!

Так мудры Ленін, мудры Сталін
Прыдбалі долю для людзей,
Адкрылі сонечныя далі,
Ачо да дна піць шчасце ўмей,
Як вуча Ленін, вуча Сталін.

Дзень Канстытуцыі сягоння, —
Вялікі дзень, святочны дзень!
Народ, што быў вякі ў прыгоне,
І блукаў без пуцця, як цень,
Ён — вольны гаспадар сягоння.

ЯНКА КУПАЛА.

Кіславодск. 30-XI-37 г.

СПАБОРНІЦТВА БРЫГАД

Магутным вытворчым уздымам сустракаюць рабочыя менскай швейнай фабрыкі «Кастрычнік» дзень выбараў у Вярхоўны Совет СССР. Першыя дні сталінскай дэкады стаханаўскіх рэкордаў адзначаны перавыкананнем плана. 1 снежня фабрыка выканала планавае заданне на 110 проц., а 2 снежня—на 118,7 проц. Брыгады спаборнічаюць паміж сабой на права атрымання за дня выбараў у Вярхоўны Совет СССР фабрычнага пераходнага сцяга.

Пашывачная брыгада майстра тав. Левіна ідзе наперадзе, яна на другі дзень дэкады выканала планавае заданне на 134,5 проц. Брыгада майстра тав. Сапожнікава выканала на 132 проц. Брыгада тав. Ерома — 128 проц. плана.

Добрыя ўзоры паказала таксама брыгада тав. Каца, якая выканала свой план у другі дзень дэкады на 126,9 проц. Раней гэтая брыгада адставала, выканаўшы ў лістападзе свой план толькі на 96,5 проц. Набірае тэмпы раней адставаўшая брыгада майстра тав. Краснасельскага. Яна выканала план на 123,1 проц.

Неабходна адзначыць, што, захапляючыся поспехамі, кіраўнікі фабрыкі выпусцілі з-пад увагі такое важнае пытанне, як папулярызацыя лепшых рэкордаў стаханаўцаў. Там толькі зараз заняліся пытаннем дзённай выпрацоўкі асобных стаханаўцаў.

БАРАЦЬБА ЗА ПЕРАХОДНЫ СЦЯГ

ВІЦЕБСК, 3 снежня. (Кар. «Звязды»). Шырока разгарнулася соцыялістычнае спаборніцтва паміж брыгадамі, лентамі і цэхамі швейнай фабрыкі «Сцяг індустрыялізацыі», накіраванае на павелічэнне тэмпаў і павышэнне якасці прадукцыі ў азнаменаванне падрыхтоўкі да выбараў у Вярхоўны Совет.

Самую вялікую норму дзённай выпрацоўкі—311 проц.—даў уцюжнік паліто-вага цэха тав. Касанаў. Замест існуючай нормы — 128 адзінак — ён выпусціў 397. Высокую прадукцыйнасць працы паказаў таксама стаханавец Меерзон. На сваім працэсе—строчка фасона—ён выканаў дзённую норму на 305 проц. Стаханаўка тав. Бакурава, якая стаіць на працэсе прышыўкі клапанаў, сваю норму выканала на 289 процантаў.

Па бручнаму цэху самую высокую норму выпрацоўкі дала Левіт Рая — 298 проц. Следам за ёю ідзе работніца Раменсан, якая раней выконвала сваю норму на 100—120 проц., а цяпер — на 242 проц.

На фабрыцы ўстаноўлен штодзённы пераходны чырвоны сцяг, які ўручаецца перадавым лентам. Сёння гэты сцяг трымае лента майстра Фрумана (бручны цэх), выканаўшая ў цэлым па ленце сваю норму на 135,5 проц. Другое месца займае лента цэха паліто майстра Смычкова — 131 проц. Значна павысіла сваю прадукцыйнасць лента каспюмнага цэха майстра Цалкіна, выканаўшая сваю норму на 113 проц. Да ўключэння ў сталінскі дэкаднік гэта лента была ў прарыве, выконвала план на 80—90 проц.

НОВЫ РЭКОРД тав. ЕЖГУРОВАЙ

ВІЦЕБСК. (Кар. «Звязды»). Ва ўчарашнім нумары «Звязды» паведамлялася аб устанаўленні маладымі стаханаўцамі швейна-кецельнага цэха фабрыкі імя Клары Цэткін тав. Ежгуровай і Пэліцан усебеларускага рэкорда, даўшы на працэсе кетлёўкі мужскіх наскоў 80 дзесятках.

Сёння, 4 снежня, тав. Ежгурова перакрыла свой учарашні рэкорд, выпусціўшы 81 дзесятак мужскіх наскоў. У 3 гадзіны дня пасля работы на фабрыцы адбыўся шматлюдны мітынг, на якім праміравалі лепшых стаханаўцаў фабрыкі, у тым ліку і ўстанавіўшых усебеларускі рэкорд.

РАСЦЕ ПРАДУКЦЫЙНАСЦЬ ПРАЦЫ

З вялікім вытворчым уздымам пачалася на менскім скурзаводзе «Большэвік» сталінская дэкада стаханаўскіх рэкордаў. З кожным днём рабочыя і работніцы павышаюць прадукцыйнасць працы.

У першым хромавым цэху стругальшчык тав. Фельман, які нядаўна працуе на гэтай рабоце, 1 снежня даў 144 проц. нормы, 2 снежня—155 проц. нормы, 3 снежня — 160 проц. нормы. Глянцоўшчыца гэтага цэха тав. Сушкова 1 снежня сваю норму выканала на 171 проц. 2 і 3 снежня—на 187 проц., дзёргальшчык тав. Матусевіч 1 снежня сваю норму выканаў на 162 проц., 2 снежня—на 190 проц., 3 снежня—на 192 проц.

Бліскучых паказальнікаў у рабоце кабілася таксама дзёргальшчыца памянёнага цэха тав. Валчок. 1 снежня яна дала 116 проц. нормы, 2 снежня—240 проц., 3 снежня—277 проц.

МЫ НА ВАРЦЕ

Служба совецкага пагранічніка цяжкая, але ганаровая і адказная справа. Совецкая моладзь, прызываючыся ў рады Чырвонай Армії, з вялікім жаданнем і радасцю ідзе ў рады слаўных пагранічнікаў, каб пільна ахоўваць заваёвы Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэволюцыі, запісаныя ў Сталінскай Канстытуцыі.

Совецкі народ нам, пагранічнікам, даверыў ахову граніц нашай сацыялістычнай бацькаўшчыны. Мы з гонарам апраўдваем гэтае давер'е народа, пільна сочым за тым, каб ні адзін вораг, шпіён, дыверсант, фашысцкі лазутчык не прабраўся на свяшчанную совецкую зямлю.

Адданай і добрасумленнай службай па ахове нашай радзімы я, радавы совецкі пагранічнік, заслужыў вялікага народнага давер'я. Працоўныя Менскай сельскай выбарчай акругі вылучылі мяне сваім кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета СССР. Які вялікі гонар быць выбраннікам народа!

Сустракаючыся з выбаршчыкамі на шматлікіх перадвыбарчых мітынгах і сходах, я бачу і адчуваю, як вялікая любоў совецкага народа да сваёй радзімы, да комуністычнай партыі, да правадыра народаў таварыша Сталіна, да сваёй непераможнай Чырвонай Армії. Армія і народ у нас адзіны ў сваіх імкненнях і творчай рабоце па пабудове комуністычнага грамадства. Армія і народ будуць адзіны ў разгроме таго, хто адважыцца парушыць нашы свяшчэнныя граніцы.

Сёння — у дзень слаўнай галавіны Сталінскай Канстытуцыі — я яшчэ раз гавару сваім выбаршчыкам:

За сваю радзіму, за свабодны совецкі народ, за партыю Леніна—Сталіна я гатоў аддаць усе свае сілы і здольнасці, усю энергію, а калі патрэбна будзе — і сваё жыццё.

Аляксандр Міхайлавіч АБРАМАЎ,
кандыдат у дэпутаты Совета Саюза па Менскай сельскай выбарчай акрузе.

ДВА ПІСЬМЫ

«Вайсковая служба ў Рабоча-Сялянскай Чырвонай Армії прадстаўляе пачэсны абавязак грамадзян СССР»—так запісана ў 132 артыкуле Сталінскай Канстытуцыі.

Два звычайныя пісьмы совецкіх пагранічнікаў, якія мы ніжэй змяшчаем — яркая ілюстрацыя да залатых слоў Сталінскай Канстытуцыі.

ПІСЬМО З ДАЛЁКАЎСХОДНЯГА КРАЯ

КАМІСАРУ ЧАСЦІ

Шкадэ, не ведаю Вашага прозвішча, тав. камісар. А жадаю Вам напісаць пра наступнае. Я брат вашага байца, які служыць у вашай часці, Калпакоўскага Івана Емельянавіча. Служу я ў радах ОКДВА з 1932 года, красавіка месяца. Знаходжуся зараз на звыштэрміновай службе.

Я вельмі рад, што мой брат папаў у вашу часць і выконвае ганаровы абавязак грамадзяніна СССР.

Зараз я Вас прашу аб тым, каб Вы мне пісалі пра ўсе недахопы майго брата, на якія я змагу яму ўказаць, і як брат дапамагчы яму ў вучобе.

Знаходжуся я ад яго зараз вельмі далёка. Пакінуў яго дома юнаком, і зарэе ганаруся тым, што ён ужо з'яўляецца байцом любімай усім народам Чырвонай Армії. Мы з братам дзеці беднай у мінулым удавы, якая люта эксплаатавалася кулакамі. Совецкая ўлада дапамагла ёй выгадаваць сваіх сыноў.

Выбачайце, таварыш камісар, што я напісаў Вам гэтае пісьмо. Лічу, што вы ўсё-ж здолеем алкаэ на яго.

Перадайце прывітанне і запэўненне ўсім байцам і камандзірам вашай часці аб тым, што я, як адзін з камандзіраў ОКДВА, упартай працаю здолею выхаваць сваіх байцоў так, каб у любы момант адстаяць ад ворагаў совецкія граніцы СССР на Далёкім Усходзе.

Няхай ведаюць ворагі, што мы, сыны ў мінулым беднай удавы, здолеем апраўдаць вялікае і ганаровае давер'е партыі Леніна—Сталіна і ўсяго народа нашай краіны.

З большэвіцкім прывітаннем — АЛЯКСАНДР КАЛПАКОЎСКІ.

ПІСЬМО З ЗАХОДНЯЙ ГРАНІЦЫ БССР

Добры дзень, дарагі брат Аляксандр Емельянавіч!

Тваё пісьмо я атрымаў, за якое горача дзякую. Мой брат, перадаю табе маё чвісцкае прывітанне і пішу, што я маю на баявой падрыхтоўцы аданакі «добра» і «выдатна». Заходнія граніцы нашай бацькаўшчыны буду ахоўваць, як вяліцу вока. Ні аднаму фашысцкаму лазутчыку не дазволю парушыць свяшчэннасць нашых рубяжоў.

Ты пішаш, што будзеш мне дапамагаць у вучобе. Я абяцаю табе і на палітпадрыхтоўцы здаць не ніжэй, чым на «добра» і «выдатна».

Яшчэ пішу табе, што я вельмі рады, што папаў служыць у пагранічаці НКВД. Служыць буду чэсна і добрасумленна. Той, хто папрабуе пераступіць нашыя граніцы — будзе біты там, адкуль ён прыйдзе.

З прывітаннем — Іван КАЛПАКОЎСКІ.
Н-скі пагранічны атрад.

ВЫДАТНЫ ГОД

Я не раз бывала ў чырвонай сталіцы—Маскве, але, такой бадзёрасці, такога ўздыму, як у час паездкі на Надзвычайны VIII Усесаюзны З'езд Советаў, яшчэ ніколі не адчувала. Ды інакш і быць не магло. Бо я ехала ў Маскву слухаць дакład вялікага Сталіна аб праекце новага асноўнага закона совецкай краіны.

Вярнуўшыся дамоў, я ездзіла па ўсіх калгасах свайго сельсовета і гутарыла з калгаснікамі аб рашэннях VIII з'езда. Я старалася даць ім адчуць усю веліч Сталінскай Канстытуцыі, сталінскага дакладу, усю веліч нашага сацыялістычнага будаўніцтва. У сваім калгасе я пачала вучыць людзей працаваць па-новаму, пастахановску. Калгаснікі бралі на сябе канкрэтныя абавязацельствы, якія яны з гонарам выконвалі.

Наш калгас мы вывелі ў рады перадавых. Калгаснікі па-большэвіцку змагаюцца за выкананне сталінскага лозунга аб 7—8 мільярдах пудоў зярна. Змагаюцца калгаснікі і за культуру. Для таго, каб жанчына магла добра працаваць у калгасе, на полі, мы адкрылі яслі. Абавязкова парашылі пабудаваць добрую лазню і школу-дзесяцігодку. Мы наладзілі работу ў клубе, дзе вельмі добра і весела калгаснікі праводзяць час.

Год работы па новай Сталінскай Канстытуцыі будзе завершаны выбарамі ў Вярхоўны Совет СССР. Я разам з актывам змагаюся за лепшую падрыхтоўку да дня выбараў.

Еўдакія Несцераўна МІНАВА,
старшыня Псбалаўскага сельсовета, Рагачоўскага раёна, кандыдат у дэпутаты Совета Нацыянальнасцей ад Жлобінскай выбарчай акругі.

ЯНЫ УПЕРШЫНЮ БУДУЦЬ ВЫБІРАЦЬ ВЯРХОЎНЫЯ ОРГАНЫ СОВЕЦКАЙ УЛАДЫ. НА ЗДЫМКУ: 18-гадовыя студэнты Беларускага медыцынскага інстытута.
Фото Казловіча (БСФ).

ШЧАСЛІВАЯ МОЛАДЗЬ

У Сталінскай Канстытуцыі запісаны небывалыя заваёвы краіны сацыялізма, дасягнутыя працоўнымі СССР пад кіраўніцтвам партыі Леніна—Сталіна. Адной з такіх буйнейшых заваёў з'яўляецца права на асвету.

Мне ўспамінаецца мой бацька, забіты белапалякамі ў часе белапольскай акупацыі. Як і большасць нашых здзявяскоўцаў, бацька быў усё сваё жыццё непісьменным. Хіба можна было ва ўмовах царскай Расіі вясковаму бедняку і наогул працоўнаму чалавеку думаць аб асвеце? Забіты і прыгнечаны памешчыкамі і капіталістамі, ён думаў толькі аб тым, як здабыць кавалак хлеба для сваёй сям'і.

У нашай вёсцы Ровенская Слабада, Рэчыцкага раёна, была трохкласная сельская школа. Гэтая песная, няўтульная школа абслугоўвала некалькі вёсак, і ў ёй маглі вучыцца толькі дзеці кулакоў і заможных. Астатняя дзетвара з самых малых год дапамагала бацькам працаваць.

Зусім інжэнны малюнак у нашай вёсны мы бачым сёння. Уласна, і вёскі ў старым сэнсе слова няма. Ёсць буйны калгас імя Дзержынскага, які яднае 320 гаспадараж. У калгасе пабудавана сталінская сярэдняя школа, у якой навучаецца больш 400 дзяцей. За годы сацыялістычнага будаўніцтва з вёскі вышла нямала кваліфікаваных спецыялістаў — тэхнікаў, інжынераў, урачоў, настаўнікаў.

Возьмем для прыкладу сям'ю калгасніка Шагавіка Аляксея Сяпанавіча. У яго сям'і адзін сын дырэктар НСШ, другі сын і дачка — студэнты мелтэхінжума, трэці сын канчае педвучылішча. Такіх сем'яў налічваецца нямала ў нашым калгасе.

Наша совецкая моладзь, перад якою шырока расчынены дзверы ў светлае, радаснае будучае, бязмежна любіць сваю сацыялістычную радзіму, яна беззаветна адданa большэвіцкай партыі і мудраму правадыру працоўных вялікаму Сталіну.

А. І. МАЦЮШЭНКА,
калгаснік, шафёр калгаса імя Дзержынскага, Рэчыцкага раёна, кандыдат у дэпутаты Совета Нацыянальнасцей ад Рэчыцкай гарадской выбарчай акругі.

5 СНЕЖНЯ

Год мінуў, але ў памяць нам ярка запалі
Дзве, з магутным імкненнем узнятых, рукі.
Ён стаіць на трыбуне, а воклічы:
— Сталін!..
Выбухаюць у зале, ідуць у вякі.
Слова Сталіна сэрцам працоўных сагрэта,
Слова мудрае справамі ўславіў народ;
Яно намі спяваецца ў жніўнае лета,
З ім заможная восень прыходзіць штогод.
Мы завем гэта слова — Вялікім законам,
Што даў вечнае права на працу, на хлеб;
Ён гарыць над радзімаю сцягам чырвоным,
На якім намалёваны молат і серп.
Сёння зранку калгаснікі ў сані паселі,
Скачуць вуліцай коні армейскай красы,
Гарманісты іграюць, нібы на вяселлі,
Бубны б'юць, маладыя гучаць галасы.
Цэлай вёскай святкуюць яны перамогу.
Ім прыемна, што ў сілу ўвабраўся мароз.
На людзей, на залітую сонцам дарогу
Ціхі іней цярушыцца з белых бяроз.
Скачуць коні па вуліцы рыссю імклівай,
Звоняць медныя бомы з-пад кожнай дугі;
Едзе ў санях юнак—ад акругі шчаслівай,
У Вярхоўны Совет кандыдат дарагі.
Ён з сяла выязджае на роўнае поле,
З ім праехаць радасна ўсёй грамадзе,
Без канца і без краю ляжыць наваколле
Ні сцяблінкі з-пад снегу не ўбачыш нідзе.
Тут пад жыта араў ён зямлю трактарамі.
Зерне чыстае сёлета дружна ўзышло...
Сваю працу, што сінімі ўкрыта снягамі,
Адзначае вяселлямі ўзімку сяло.
Кожны дзядзька сваім назаве яго зяцем.
Ганарыцца і ён, між бацькоў дарагіх,
Пеўміручым арцельным дабром і багаццем,
Як пасагам каханай дзяўчыны жаніх.
Сярод чыстага поля ваня ён спыняе.
Бачыць: з саняў шырокіх народ устае,
Нехта снег расклёвае: пад снегам жывая
Рунь іскрыцца. І людзі глядзяць на яе.
Ім здаецца, што з імі — у шэрым шынелі
Сталін родны над рунню схіляецца сам,
Пазнае брыгадзіраў славутай арцелі.
— Будзе добрае жыта!..—гаворыць
дзядзькам.
Б'ецца радасна сэрцы ад светлай
пашаны...
Заінелі вусы і бароды ў дзядзькоў.
Іх багатыя землі навечна ўзараны
І яму буйным зернем даспела любоў.
Зэле гэта любоў наша ўсмешкаю яснай,
Цёплай хваляй з сардэчнай ідзе глыбіні,
Добра ёй, як і ўзрошчанай руні
калгаснай,
Сніць у снежаньскі час ураджайныя дні.
Сёння вечар ахутае нашы прасторы
І пад зорамі неба зайскрыцца зямля,
Мы-ж уявім, што гэта крэмлёўскія зоры
І што ўсе мы жаданыя госці Крэмля...
Б'е гадзіннік.
І серца спакойныя ўдары
За Крэмлёўскай сцяною чуваць у цішы;
Ён працуе і ведае ўсе нашы мары,
І так радасна, светла ў нас на душы.

Аркадзь Куляшоў

АРТЫКУЛ 122

У артыкуле 122 Сталінскай Канстытуцыі гаворыцца: «Жанчыне ў СССР прадастаўляюцца роўныя правы з мужчынам ва ўсіх галінах гаспадарчага, дзяржаўнага, культурнага і грамадска-палітычнага жыцця». Гэтыя залатыя словы, напісаныя рукой вялікага Сталіна, мы, работніцы, адчуваем на сабе штодзённа, штогадзінна.

Наш рабочы калектыў ільнапрадзільнай фабрыкі імя Кагановіча на 70 проц. складаецца з жанчын. Жыццё гэтага калектыва — яркая ілюстрацыя да артыкула 122 Сталінскай Канстытуцыі.

Старыя працаўніцы ўспамінаюць сваё праклятае мінулае, калі праца была кабалой, няшчасцем і горам. Банкаброшніца за 12-гадзінны рабочы дзень атрымлівала 50 капеек. Дзённы заработак кваліфікаванай ватэрнічыцы не перавышаў 80 капеек. Гэта праклятае мінулае навекі ўшло разам са старым царскім ладам. У нас у даны момант сярэдні дзённы заработак банкаброшніцы за 7 гадзін складае 10 з лішнім рублёў. Розніца настолькі адчувальная, што ніякаму параўнанню не падлягае!

Што ні месяц заработак нашых работніц расце ўсё больш і больш. За перыяд сакавік—верасень гэтага года дзённы заработак гекельнічыцы (часальны цэх) павысіўся ад 6 р. 45 к. да 9 р. 58 к. За гэты кароткі перыяд дзённы заработак ватэрнічыцы-двухстаронічыцы павысіўся ад 8 р. 54 к. да 10 р. 12 к. Калі ў сакавіку ткачыха, працуючая на адным станку, зарабляла ў дзень 3 р. 60 к., то ўжо ў верасні яе заработак склаў 8 р. 53 к., а дзённы заработак ткачыхі, працуючай на двух станках, павысіўся ад 6 р. 37 к. да 11 р. 97 к. і т. д.

У аплаце працы няма ў нас розніцы паміж мужчынамі і жанчынамі. Напрыклад, зменныя майстры прыгатавальнага цэха Рашчынская і Тачыліна атрымліваюць тыя-ж 450 руб. у месяц, што і зменныя майстры гэтага цэха Чыжоў, Брахноў і інш., а бывае, што майстры-жанчыны атрымліваюць нават больш за майстраў-мужчын. Узяць к прыкладу брыгадзіра ватэрнага цэха Земяніну. Яе месячны заработак складае 304 руб., у той час, калі брыгадзір гэтага цэха Пішкін зарабляе 296 руб. І гэта зусім зразумела: не пол адыгрывае ў нас ролю, а выкананне плана.

Я ўжо адзначыла вышэй, што жанчыны ў нашым рабочым калектыве складаюць больш 70 проц. У стары час на фабрыцы такэсама працавалі ў большасці жанчыны. Але ні адна старая працаўніца нашай фабрыкі не можа ўспомніць такога выпадку, каб хто-небудзь з жанчын знаходзіўся на камандным пасадзе, скажам, каб жанчына была брыгадзірам або падмайстрам. Гэтага не бывала і не магло быць пры старым ладзе.

А зараз... Жанчын-інжынераў на нашай фабрыцы — 4. Назаву іх па прозвішчах і пасадах: т. Лондан — кіраўнік групы працы, т. Айзіковіч — заг. лабараторыяй, т. Алімава — начальнік зазырыкінскіх ватэраў і т. Хадароўская—інжынер-будаўнік.

Жанчын - тэхнікаў налічваецца 16 чалавек. Яны ў сваёй большасці займаюць пасады майстраў. Тав. Тачыліна, напрыклад, — зменны майстар прыгатавальнага цэха, Зільберборт — заг. тэхнікай безапаснасці. Жанчын-брыгадзіраў, сярод якіх знаходзіцца і маё прозвішча, ёсць у нас 10 чалавек і жанчын-падмайстраў — 5 чал. Лічбы вельмі ўнушальныя. Яны жыва сведчаць аб вялікай ролі жанчыны ў кіраўніцтве нашай фабрыкай.

У стахановскай школе займаецца 80 жанчын, а ва ўсёй сетцы тэхнічнай асветы — 270 жанчын.

Нямала жанчын налічваецца сярод партыйнага, прафсаюзнага і грамадскага актыву. Тав. Кавалеўская — нам. сакратара парткома, тав. Міхайлава — член парткома. Жанчын — старшынь цэхавых камітэтаў і прафоргаў на фабрыцы 68 чалавек, членаў пленума фабкома — 11.

Ёсць у нас жанчыны — члены ўрада. Гэта тав. Пыганкова — член ПВК СССР, тав. Мягкая — член ПВК БССР. 11 жанчын — дэпутаты Віцебскага горсовета (Шчаглова, Земяніна, Раманава і інш.). Збяўдзіліся прароцкія слозы Леніна аб тым, што кожная кухарка павінна ўмець кіраваць дзяржавай. Пыганкова, Мягкая і інш. — гэта старыя работніцы, у мінулым зусім непісьменныя. Кіраваць дзяржавай іх навучыла совецкая ўлада, комуністычная партыя.

Не хочацца мне прыводзіць многа лічбаў. Ніякімі-ж лічбамі нельга з усёй паўнатой адлюстраваць сталінскія клопаты аб нас, жанчынах! Але некаторыя даны ўсё-ж прыведу.

Толькі за 9 месяцаў гэтага года (студзень—верасень) дзяржава заплаціла 237 нашым работніцам дапамогі па цяжарнасці 134.000 рублёў. Апрача таго, рад маці-ярэй па стану здароўя былі пасля родаў далаткова вызвалены ад работы і ім заплацілі 11.800 рублёў (поўнасцю захавалі іх сярэднюю заработную плату). На дапамогу матерам на карміленне дзяцей выдаткавана за гэты час 20.690 рублёў. Многасямейным была аказана дапамога ў суме 8.195 рублёў. На ўтрыманне двух дзіцячых салёў апрача яслей ушло 137.000 рублёў плюс 8.000 руб. на антыраўнепельную дзіцячую кампанію. А дзеці-ж нашы, апрача ўсяго, бясплатна навучаюцца ў школах, на што дзяржава выдаткуе велізарныя сродкі.

Ці бачана, ці чутна гэта ў якой-небудзь іншай краіне, апрача нашай краіны Советаў? Ніадзе, ніадзе няма такіх штодзённых клопатаў аб матерах і дзецях!

Запытайце любую нашу работніцу-калгаўчыху, ці ведала яна ў стары час, што азначае дом адпачынку або курорт. Работніка Раманава, напрыклад, кажа, што самае слова «курорт» яна пачула толькі пры совецкай уладзе і не толькі пачула, але і атчула яго. За гэтыя-ж 9 месяцаў у рэспубліканскіх і мясовых домах адпачынку напраўлялі сваё здароўе 200 работніц нашай фабрыкі, за што заплочана фабрыкай 30.000 рублёў. На турыстскія путёўкі выдаткавана 2.680 руб. Вялікая колькасць работніц была ў гэтым годзе на курортах (Сочы, Еўпаторыя, Старая Руса і інш.) і ў розных санаторыях, на што выдаткавана 15.400 рублёў.

Вось яна, Сталінская Канстытуцыя, у дзеянні! А я-ж узяла ў прыклад кароценькі перыяд часу і адну толькі нашу фабрыку — адно з велізарнай колькасці прадпрыемстваў, якімі ўсеяна наша необсяжная краіна.

Мы, жанчыны, — поўнаправныя грамадзяне вялікага Совецкага Саюза. Мы — дзяржаўныя дзеячы, мы — актыўныя ўдзельнікі палітычнага і грамадскага жыцця. Гэтыя правы дала нам партыя Леніна—Сталіна, совецкая ўлада, наш дарагі правадыр і настаўнік таварыш Сталін!

Вось чаму мы так горача любім нашу партыю, наш рабоча-сялянскі ўрад, вось чаму мы так бязмежна адданы вялікаму Сталіну.

У гістарычны дзень 12 снежня з высока ўзнятымі чырвонымі сцягамі, з імем Сталіна на вуснах, гордыя, шчаслівыя і радасныя, мы — жанчыны — пойдзем на выбарчых урнаў выбіраць у вярхоўны орган совецкай улады лепшых людзей нашай радзімы.

Маё асабістае шчасце ўдвая вялікае. Працоўныя Віцебскай гарадской выбарчай акругі аказалі мне высокае давер'е, вылучылі кандыдатам у дэпутаты Совета Саюза Вярхоўнага Совета СССР. І сёння, у дзень вялікай галавіны Сталінскай Канстытуцыі, мне хочацца ад усёй душы паўтарыць словы незабыўнага Сергея Міронавіча Кірава, забітага праклятымі ворагамі народа — трацкісцка-зіноўеўска-бухарынскімі бандытамі:

... Так хочацца жыць і жыць!

БАГАЧОВА Ольга Ефімаўна,
кандыдат у дэпутаты Совета Саюза Вярхоўнага Совета СССР ад Віцебскай гарадской выбарчай акругі.
Віцебск.

ГРАМАДЗЯНАМ горада МЕНСКА

Адкрытае пісьмо былых чырвонагвардзейцаў і старых большэвікоў Варашылаўграда

Дарагія таварышы!

У гэтыя знамянальныя дні, напярэдадні выбараў у Вярхоўны Совет СССР, кожны з нас у думках аглядае пройдзены шлях. У памяці паўстаюць дзесяцігоддзі цяжкай, жорсткай барацьбы, узнікаюць вобразы баявых таварышоў, праліваўшых сваю кроў за справу сацыялізма, за тыя перамогі, якія запісаны ў вялікай Сталінскай Канстытуцыі. І кожны з нас зноў і зноў пераконваецца: так, кроў нашых таварышоў не праліта дарма!

Калі мы, старыя луганскія рабочыя, чырвонагвардзейцы і большэвікі, успамінаем аб мінулым, то перш за ўсё думаем аб тым чалавеку, чыё імя з гонарам носіць зараз наш рабочы горад. Гэты чалавек—Клімент Ефрэмавіч Варашылаў, першы пролетарскі маршал, палкаводзец непераможнай Чырвонай Арміі. Мы сардэчна вітаем вас, працоўныя горада Менска, з высокім гонарам: у вашай гарадской выбарчай акрузе даў згоду балатавацца ў дэпутаты Совета Саюза таварыш Варашылаў.

Гэта вялікае шчасце—аддаць свой голас такому чалавеку, як наш любімы нарком абароны. Не толькі мы, яго землякі, прыяцелі яго юных год, ведаем тав. Варашылава як вернага сына большэвіцкай партыі; уся краіна, увесь народ, прыяцелі нашай сацыялістычнай радзімы ва ўсім свеце захапляюцца доблесцю, мужнасцю і адвагай, рэволюцыйнай вытрымкай кіраўніка Чырвонай Арміі. І нават ворагі не раз, скрыгочачы зубамі, вымушаны былі прызнаць яго высокія дастоінствы.

Мы памятаем, як 40 год назад юнага Варашылава ўпершыню арыштавалі за тое, што ён адмовіўся скінуць шапку перад прыставам. Яму было ўсяго 16 год, але ў ім адчуваўся ўжо жалезны характар растучага рэволюцыйнага арла. І колькі разоў пасля—у падпольных гуртках, у дні забастовак і крывавых схватак з паліцыяй, у суровыя годы грамадзянскай вайны—мы адчувалі ўсе абаянне і прастату нашага лепшага друга, таварыша, неадлучнага ад свайго класа. Далікатнасць, чуласць да таварышоў заўсёды спалучаліся ў ім з жалезнай стойкасцю ў барацьбе, з яраснай нянавісцю да ворагаў.

Вуліцы, масты, заводы нашага горада—усё напамінае аб слаўнай юнасці большэвіка К. Е. Варашылава.

Мы ўспамінаем у гэтыя дні бурны, рэволюцыйны 1905 год, калі ўсе рабочыя Луганска аднадушна выбралі Клімента Ефрэмавіча Варашылава старшынёй у першым сходзе рабочых дэпутатаў. То быў наш будучы луганскі совет, першы орган пролетарскай дыктатуры, які ўжо тады прымушаў буржуазію лічыцца з сабой.

Летам 1905 года совет і падпольны камітэт большэвікоў узнялі рабочых завода Гартмана на забастоўку. На гэтым заводзе, носячым зараз імя Кастрычніцкай рэволюцыі, працаваў тады К. Е. Варашылаў. Ён быў душой, кіраўніком усёй рабочай масы. Але вось аднойчы награнула паліцыя: Клімента Ефрэмавіча схапілі, збілі і арыштавалі. Мы памятаем добра, як забушавала тады ў нашых сэрцах нянавісць да прыгнятальнікаў. Рабочыя рашылі ва што-б там ні стала вырваць з лап паліцыі свайго любімца «таварыша Валодзю». (Гэта была падпольная клічка Варашылава).

Калі жандары павялі Варашылава ў турму, група нашых дружыннікаў стала на дарозе, спадзеючыся падлавіць момант і вызваліць свайго баявога кіраўніка. Аднак вызваліць Варашылава было не так проста. Калі з заводскіх варот вывелі арыштаваных, мы ўбачылі, што паліцыя рыхтуе правакацыю. Чуялі ворагі, хто такі Варашылаў, як небяспечны ён для іх! Яго вялі, звязаўшы яму рукі назад. Канцы вяровак трымалі конныя жандары. У такой абстаноўцы мы не знайшлі магчымым выступаць. Нельга было даць жандарам повад забіць нашага друга «пры спробе ўцячы». А яны чакалі гэтага поваду!

Варашылаў недарма вучыў нас, што вытрымка, а не безрассудства павінны адзначаць пролетарскага байца. І мы, з цяжкасцю стрымліваючы ярасць, адмовіліся ад свайго плана, але барацьбы за вызваленне тав. Варашылава не спынілі.

У кастрычніку рабочыя Луганска шматтысячным натоўпам асадзілі турму, патрабуючы вызвалення К. Е. Варашылава. Казакі разагналі нас бізунамі. Тады быў склікан велізарны мітынг. На гэты мітынг былі выкліканы вышэйшыя паліцэйскія чыны горада. Яны не адважыліся адмовіцца ад нашага «запрашэння». Мы прымусілі царскіх слуг схіліцца перад грозпай сілай рабочага класа, і да вечара Варашылаў прыйшоў з турмы прама на мітынг, дзе яго сустрэла лікуючая маса людзей. Тут-жа ён быў выбран старшынёй.

Так склалася тады, трыццаць два годы назад, нерухомая, святая дружба наша з таварышам Варашылавым. Рабочыя любілі яго за большэвіцкую праўду, якую ён нёс у масы, за яснасць мэты, якую ён сам указваў, за тое, што ён узбройваў нас і вучыў біць ворага і перамагаць. У глухой балцы за Каменным бродам мы збіраліся і вучыліся страляць з рэвольвераў, прывезеных нам Варашылавым. Дружыннікі па чарзе білі па шапках і картузах, уяўляўшых мішэні. Але вось раздавалася каманда:

— Клім Варашылаў, на лінію агню!

Варашылаў выходзіў уперад, узнімаў руку з рэвольверам. І ледзь толькі чулася слова «плі», як грымеў выстрал і вісеўшы на пальцы картуз паварачваўся, нібы ад моцнага ветру.

— Брава! — крычалі дружыннікі.

А Варашылаў тым часам спакойна ўсаджваў у картуз другую кулю.

— Чырвоным генералам у нас будзеш, — жартавалі таварышы, не падазраючы, быць можа, як блізка да ісціны гэта пракаранне. Яны выражалі толькі сваю мару — убачыць тав. Варашылава на чале арміі перамогшага пролетарыята. І вось цяпер гэта мара здзейснілася. Мільёны маладых людзей нашай краіны вучацца зараз валодаць зброяй, рыхтуючыся да абароны радзімы ад пасягацельстваў ворагаў. І зараз, як і трыццаць год назад, няма лепшай пахвалы для чырвонага стралка, чым апэнка: «Страляе, як Варашылаў».

Праз дванаццаць год, па загаду Варашылава, мы пабудавалі на заводзе Гартмана два бронепаязды, снаралзілі іх і адправілі ў бой з нямецкімі войскамі, якія наляцелі на Украіну, быццам саранча. Тады, у халодныя сакавіцкія дні 1918 года, тав. Варашылаў стаў на чале гэтай арміі і павёў пролетарскія атрады супроць удзесяцера мацнейшага ворага. Мужны прыклад першага рабочага камандзіра натхняў нас у гэтай небяспечнай і незабыўнай барацьбе. Яго адвага і большэвіцкая ўпартасць ўзбройвалі нас усіх, як-бы папаўняючы недахоп нашай ваеннай тэхнікі і ведаў. Ці-ж інакш маглі-б мы вытрымаць вядомы паход на Царыцын, які будзе славіцца ў вяках, як гераічная старонка барацьбы рабочага класа?

Мы ішлі на Царыцын з баямі, увозячы з сабою зброю, боепрыпасы, заводскія станкі, часткі машын, каштоўныя металы. Нічога не павінна было дастацца ворагу. Наш камандарм таленавіта адбіваў атакі ворага і заўсёды быў з байцамі на самых небяспечных месцах. Не раз тав. Варашылаў бываў на валасок ад гібелі. Яшчэ да царыцынскага паходу, у баях пад Канатопам, ля станцыі Дубавязаўка немцы палверглі жорсткаму абстрэлу наш брэнявік, вывелі са строю гарматы. Пляцоўка была завалена забітымі і ранепымі таварышамі.

— Быў момант, — расказвае адзін з удзельнікаў гэтага бою.—калі здавалася, што Варашылава няма ўжо ў жывых. Якраз між намі разарзаўся снарад, плюхнуўшы ў твар крывёю і зямлёй. Я працёр вочы і ўпэўніўся, што Варашылаў жывы.

Праз смерць і агонь, праз кальцо ворагаў прарваліся мы ў Царыцын да таварыша Сталіна і прывялі з сабой сто паравозаў, тры тысячы вагонаў, гружаных снарадзеннем і матыпамі, і трыццаць тысяч байцоў з сем'ямі. Толькі ваенны талент Варашылава быў здольны на такую рызыкоўную і складаную аперацыю. Толькі жалезная воля большэвіка, які не баіцца труднасцей і смела ідзе ім насустрач, магла выйсці пераможцам у гэтай цяжкай барацьбе.

Потым пацягнуліся годы, калі імя Варашылава грымела на франтах грамадзянскай вайны, усяляючы страх у сэрцы ворагаў. Клімент Ефрэмавіч будаваў Чырвоную Армію, выхоўваў байцоў у духу бязмежнай адданасці ленінізму. Гэтага не мог цярпець прэзрэнны здраднік Іуда-Троцкі, які не раз прабаваў удаліць з Чырвонай Арміі, апагаліць яе лепшага сына і аддапейшага барацьбіта. Варашылаў дзейнічаў заўсёды так, як таго патрабавала партыя, як яго вучылі Ленін і Сталін. І ён дабіваўся перамогі на франтах, наперакор здраднічству Троцкага, які не раз прабаваў асудзіць нашу армію на паражэнне.

Такім мы ведалі нашага Варашылава, аднаго з лепшых людзей рабочага класа. Калі зноў грымне грозны час вайны і шалёны вораг рызыкне парушыць совецкія граніцы, па ўсёй краіне пранясецца клич нашага чырвонага палкаводца:

— На лінію агню!

І ўжо не з браўнінгамі, як у памятнай балцы пад Луганскам, не з саматужнымі браневікамі 1918 года рынецца ў бой наш народ. Магутныя стаі паветраных караблёў закрыюць сваімі крыламі ўсё неба над ворагам. Гудучы маторамі, панясуцца шарэнгі сталёвых танкаў, дазячы і знішчаючы праціўніка. На ліхіх конях паімчыцца чырвоная конніца. Уздоеная першакласнай тэхнікай, совецкая пяхота жалезным патокам залье тую тэрыторыю, адкуль прыйдзе вораг. І ворагу не будзе літасці!

З радасцю чулі мы словы свайго наркома 7 лістапада ў часе парада на Краснай плошчы: «Наша армія існуе не для нападу, але толькі да моманту нападу ворага на нашу радзіму. Яна будзе самай нападаючай з усіх калі-небудзь нападаўшых армій, калі вораг яе прымусіць да гэтага».

Мы слухалі, і кожны з нас гаварыў:

— Правільна! Гэта нашы словы!..

Таварышы выбаршчыкі горада Менска!

Ваша рэспубліка ляжыць на заходняй граніцы вялікага Совецкага Саюза. У выпадку ваеннага нападу з Захада вы будзеце першымі на лініі агню. Гэтым вы заслугоўваеце аказанае вам давер'е—паслаць дэпутатам у Совет Саюза першага маршала нашай радзімы. Вы будзеце выбіраць яго і ад нашага імя, ад імя ўсяго совецкага народа, чыім любімцам з'яўляецца саратнік вялікага Сталіна—Клімент Ефрэмавіч Варашылаў.

Мы вітаем грамадзян сталіцы Совецкай Беларусі напярэдадні знамянальнага дня выбараў у Вярхоўны Совет. Мы шлем вам гарачыя прывітанні. Жадаем і ў далейшым паспяхова працаваць, мацаваць абарону радзімы. А калі налыне час вайны, то ўсе разам—старыя і маладыя, рабочыя і калгаснікі, як спяваецца ў песні,

По дорогам знакомым
За любимым наркомом
Мы коней боевых поведем!

П. І. Пузанаў—58 год, член ВКП(б) з 1903 года—старшыня Варашылаўградскай акруговай выбарчай камісіі.
І. Д. Літвінаў—55 год, член ВКП(б) з 1904 года.
А. В. Цітовіч—62 год, член ВКП(б) з 1905 года.
Д. Б. Багданаў — 51 года, член ВКП(б) з 1912 г.
І. Е. Набівач—52 год, член ВКП(б) з 1912 г.
І. І. Алексееў—68 год, член ВКП(б) з 1917 г.
А. П. Шэлехаў—63 год, член ВКП(б) з 1917 г.
В. П. Гусарэў—54 год, член ВКП(б) з 1917 г.
І. Н. Нагіх—57 год, член ВКП(б).

КАЛІ ГАВАРЫЦЬ ПРАВАДЫР...

Ёсць у жыцці моманты, якія ніколі не забываюцца.

Я не помню такога захапляючага відовішча, якім было адкрыццё Надзвычайнага VIII Усесаюзнага З'езда Советаў. Гэта была незабыўная дэманстрацыя любві і адданасці вялікага перамогшага шчаслівага народа да свайго правадыра і настаўніка Сталіна, тварца Сталінскай Канстытуцыі. Яшчэ залоўга да адкрыцця з'езда з росных канцоў чырвонай сталіцы плывуць праз Крэмлёўскія вароты патокі народа — дэлегаты і госці з'езда. Вялікая крэмлёўская зала капаўняецца сваёдным, рознаплямённым магутным совецкім народам. Тысячы лепшых сыноў соцыялістычнай радзімы сышліся сюды, каб заперадзіць новы сталінскі закон, вялікую хартыю свабоды і правоў чалавека.

Настрой гэтага народнага мора, сабранага з усіх канцоў неасяжнай совецкай зямлі, святочны, узняты, усхвалёзаны. Набліжаецца хвіліна адкрыцця з'езда, паяўлення за сталом прэзідыума любімых народам кіраўнікоў партыі і совецкай улады і вялікага з вялікіх, «таго, чыё імя на вуснах ва ўсіх», геніяльнага, любімейшага настаўніка і правадыра народаў. І гэтая хвіліна прышла!

Цэлых пятнаццаць хвілін працягваецца бурная авацыя вялікаму Сталіну, калі ён паявіўся на трыбуне. Грамавыя перакаты магутнага «ура» страсаюць сцены крэмлёўскай залы. На ўсіх мовах гучыць імя Сталіна, прывітальныя воклічы любімаму правадыру ляцяць на трыбуну радасны народ. Горача вітаюць таварыша Сталіна і ў дыпламатычных ложах. Толькі ў ложах не дужа прыязных нам дзяржаў заметна збянтэжанасць, нязграбнае топтанне, бо язык парушыць сваю не дужа высокую рэпутацыю.

Таварыш Сталін пачынае свой выдатны даклад. Зала замірае. З напружанай увагай слухаюць дэлегаты ясныя ў сваёй геніяльнай прастаце і даступнасці словы правадыра народаў аб новым совецкім законе, аб здабытках вялікай соцыялістычнай рэволюцыі аб правах совецкага грамадзяніна. Так проста і ясна і ў той-жа час так глыбока можа гаварыць толькі той, хто дасканала і ўсебакова валодае праўдаю жыцця і ясна бачыць і ведае кірункі яго дарог, той, хто па праву выступае ад імя многамільённых мас прапоўнага народа ўсяго свету.

Я ўпершыню бачу зблізку найвялікшага чалавека нашай эпохі, узіраюся ў рысы яго твару, у яго крэпкую, мужную фігуру: я ўслухваюся, як і тысячы людзей навакол, у яго голас, у яго словы, у яго асаблівую, толькі яму ўласцівую, форму даклада. Яго сказы прасякнуты мудрасцю. Яго логіка непераможна.

Мы, совецкія паэты і пісьменнікі, шмат напісалі песень і іншых мастацкіх твораў пра вялікага Сталіна, пра Сталінскую Канстытуцыю. Але ўсё намі напісанае яшчэ не ахоплівае ўсёй велічы і глыбіні мудрасці нашага правадыра і яго Канстытуцыі. Наша задача знайсці форму і адпаведныя словы для аблюстравання гэтай велічы і глыбіні.

ЯКУБ КОЛАС.

Я СЛУХАЎ І БАЧЫЎ СТАЛІНА

Год прайшоў, а здаецца толькі ўчора гэта было. Так жыва ўспамінанне аб днях, праведзеных у Крэмлі, аб гістарычным з'ездзе, які зацвярджаў Сталінскую Канстытуцыю. Самае дарагое, чаго ніколі не забудзеш, гэта тое, што я сваімі вачыма ўпершыню ўбачыў нашага правадыра і настаўніка Іосіфа Вісарыёнавіча Сталіна. Цяжка перадаць простымі словамі, што было ў зале ў момант, калі на трыбуну з'езда выйшаў таварыш Сталін і разам з ім яго слаўныя саратнікі. Усе дэлегаты на розных мовах віталі яго, апладыравалі, кожны выказваў сваю бязмежную радасць. Ажыццявілася мая мара. Я ўбачыў чалавека, які падняў рабочы клас на такую недасягальную вышыню і даў усім прапоўным шчаслівае і радаснае жыццё.

Прайшоў год. Але ў мяне штодзённа стаіць у памяці гістарычны VIII З'езд. Я быў адным з тых, хто разам з нашымі правадырамі абмяркоўвалі і зацвярджалі Сталінскую Канстытуцыю. Я ўбачыў нашага правадыра, адчуў, які ён блізкі да нас, прапоўных. Проста апрануты, проста гаворыць, цёпла, па-таварыску адносіцца да людзей.

Я слухаў даклад правадыра і мне здавалася, што слухаю прыгожую музыку. Я быў так захоплен, што дзве гадзіны здаліся хвілінамі. Усе ў нашай краіне ведаюць гэты даклад. Усё так праўдзіва, проста, даходна і трапна ў ім. Мне помніцца, як мы ад душы смяяліся, калі таварыш Сталін палверг рэзкай знішчальнай крытыцы буржуазных крытыкаў Канстытуцыі. З кожным днём мы ўсё больш бачым праўдзівасць кожнага слова сталінскага даклада.

Вось, напрыклад, Сталін гаварыў аб тым, што рабочы клас СССР — гэта зусім новы клас. Гэта-ж сапраўды так. У стары час рабочы быў рабом, ад пямна да пямна гнуў сваю спіну на капіталістаў. Цяпер я працую 7 гадзін і маю 17 гадзін свабодных. Нам не трэба стаяць ля брамы заводаў у чаканні работы. Кожнаму з нас Сталінскай Канстытуцыяй забяспечана права на працу. А праца ў нас — справа славы, гонару, доблесці і геройства. Таму вось я, маючы 58 год жыцця, радасна прадаўжаю прапавань. Мне прапанавалі перайсці на пенсію, але я адмовіўся. Пакуль ёсць сілы, хачу сам удзельнічаць у соцыялістычным будаўніцтве.

Рабочы клас нашай краіны стварыў сваю тэхнічную інтэлігенцыю. Сталінская Канстытуцыя забяспечыла нам права на адукацыю. Дзесяткі рабочых нашага завода сталі інжынерамі, тэхнікамі. На заводзе ёсць школа майстроў соцыялістычнай працы. Я аб адукацыі і марыць не мог, а сын мой Васіль вучыўся ў Ленінградзе і стаў інжынерам. Другі сын, Аляксей, таксама вучыцца ў інстытуце.

І, нарэшце, я — рабочы-каваль—быў паслан народам, каб разам з кіраўнікамі партыі і ўрада, разам з вялікім Сталіным абмяркоўваць і зацвярджаць Сталінскую Канстытуцыю. Усім вядома, колькі радавых рабочых і калгаснікаў кіруюць нашай дзяржавай. Ці-ж гэта не новы рабочы клас!

Пасля з'езда, пасля даклада правадыра я нібы стаў новым чалавекам. Ва мне яшчэ больш узмацнілася вера ў справу партыі Леніна—Сталіна, у сілу і магутнасць нашай соцыялістычнай радзімы. 15 год я працую кавалём на заводзе імя Кірава. Увесь час быў перадавым рабочым і стаханаўцам. А пасля з'езда я з яшчэ большай энергіяй узяўся за работу. З радасцю я спяткаў заклік стаханаўцаў Сталінскага раёна горада Масквы. І мы ў дні сталінскай дэкады стаханаўскіх рэкордаў пакажам новыя ўзоры работы.

Хутка 12 снежня, дзень, калі мы ўпершыню ў гісторыі будзем выбіраць на аснове Сталінскай Канстытуцыі. Свой голас я аддам толькі люцізм, верным партыі Леніна—Сталіна, лепшым патрыётам нашай соцыялістычнай радзімы.

Фашысты рыхтуюць вайну супроць СССР. Але няхай яны зарубяць сабе на носе, што мы, рабочы клас СССР, калі трэба будзе, станем разам з нашай доблеснай Чырвонай Арміяй на абарону нашай соцыялістычнай радзімы і разгромім ворага на яго ўласнай тэрыторыі.

БАБЫЛЁЎ Андрэй Акімавіч,
дэлегат Надзвычайнага VIII Усесаюзнага З'езда Советаў, майстар кавальскага цэха гомельскага станкабудаўнічага завода імя Кірава.

ДРУЖБА

Чырвонаю плошчай,
сталіцай Масквой
Праходзяць народы
радзімы маёй.
Прыходзяць
да яркіх, пылаючых зор
Усе адзінаццаць
рэспублік-сясцёр.
І кожная
радасць у сэрцы нясе.
Бязмежную ласкай
сагрэты усе.
Крэмлёўскія вежы.
Сцяна.
Маўзалей.
Там Сталін вітае
шчаслівых дзяцей.
І бачыць
між грому вітальнага ён
У поступе мужным
прыгожых калон —
Упеху за клопат
і працу сваю,
Адзіную брацкіх народаў
сям'ю.
Вось горны
з лавой зінаграднай ідуць.
Украіны
колас пшаніцы нясуць.
Вось рускі
узняў у жытах махавік.
Бавоўну як пух уздымае
таджык,
З канопляміі, лёнам
прайшоў беларус...
І славяць вялікі
Совецкі Саюз.
Асветлены
полымем сталінскіх зор
Усе адзінаццаць
рэспублік-сясцёр.

Пятрусь Броўка

СТАЛІНСКАЯ КАНСТЫТУЦЫЯ— СОНЦА КРАІНЫ

(З народнай творчасці)

Мы сёння святкуем вялікае свята —
Дзень Канстытуцыі — радасны дзень
Краіны свабоднай, краіны багатай,
Краіны, дзе шчасце усюды цвіце;

Дзе дружная праца струменіць
бясконца,
Дзе Сталіна роднага зяе закон. —
Ён зяе, як самае яркае сонца,
І кліча наперад, да лепшых шчэ ізён

Орша. Г. НЕВЯДОМСКІ.

***

Выйду, сяду на крылечка
Запяю я, малады:
Далі нам зямлю навечна —
Будзе нашай заўсягды.
З кожным месяцам і годам
Лепей жыць становіцца
Ад таго, што родны Сталін
Пра мяне клапоніцца.

В. ЯСЬКОЎ.
Капаткевіцкі раён.

***

Мы заможнымі ўсе сталі,
Расце шчасце з кожным днём.
Дзякуй вам, таварыш Сталін,
За шчаслівае жыццё!

За Канстытуцыю, за радасць,
За веліч, славу нашых дзён
Дзякуй вам, таварыш Сталін,
За выдатны наш закон.

І. КУЛЯШОЎ.
Клімавіцкі раён.

ВЫБАРШЧЫКІ АБ СВАІХ КАНДЫДАТАХ

Грыгорый КУЛІК

Я мела гонар прапанаваць агульнаму сходу рабочых і работніц нашай запалкавай фабрыкі «Х Кастрычнік» кандыдатуру ў дэпутаты Совета Саюза тав. Куліка Грыгорыя Іванавіча. Маю прапанову сустрэў дружным апладысментамі ўвесь рабочы калектыў. Зараз, калі тав. Кулік даў згоду балатыравацца і зарэгістраваны кандыдатам у нашай выбарчай акрузе, усе рабочыя расказваюць адзін аднаму біяграфію свайго дэпутата, вернага сына нашай радзімы. Ён у пяжкія годы для нашай маладой Совецкай рэспублікі прыняў актыўны ўдзел у ліквідацыі грыгор'еўскага паўстання, у ачышчэнні совецкай зямлі ад полчышчаў Дзенікіна, Врангеля, белапалякаў. Тав. Кулік быў адным з удзельнікаў слаўнай эпапеі абароны Царыцына, якою кіравалі таварыш Сталін і таварыш Варашылаў. Стойкі большэвік, адданы да канца сваёй совецкай радзіме, ён па-сталінску выконваў усе заданні партыі і ўрада па ўмацаванню абароназдольнасці нашай краіны. За вялікія заслугі перад совецкім народам на грудзях у тав. Куліка красуюцца тры ордэны баявога Чырвонага Сцяга і ордэн Леніна. Разам з усім рабочым калектывам нашай фабрыкі я падыйду 12 снежня да выбарчай урны і аддам свой голас за героя грамадзянскай вайны, слаўнага камандарма другога ранга тав. Куліка Грыгорыя Іванавіча.

ТОКАРАВА ВАСІЛІСА МІРОНАЎНА,
работніца запалкавай фабрыкі «Х Кастрычнік», вытворчы стаж 27 год.

Ніна ЛІСУНОВА

Лісунову Ніну Пятроўну мы ведаем з першага дня яе работы на фабрыцы. З 1931 года мы працуем разам з Нінай у матальным цэху. Спачатку яна была чорнарабочай, потым вучылася ў фабзавучы, дзе была лепшай вучаніцай. Ніна датэрмінова скончыла фабзавуч і пайшла ў цэх. Яна хутка авалодала складанай матальнай машынай і пачала перавыконваць нормы.

Некаторы час матальны цэх выпускаў вялікі процант шоўку 3-га гатунку. Калі ўстала задача знізіць да мінімума выпуск прадукцыі ніжэйшага гатунку, наш цэх, па прыкладу іншых фабрык перайшоў на вязку малкоў рукамі. Тав. Лісунова была тут першаю і павяла астатніх матальшчыц на барацьбу за добраякасную прадукцыю.

Мы ведаем Ніну як добрага, чулага таварыша. Заўсёды Лісунова гатова дапамагчы кожнаму ў рабоце.

Ніна—першы ініцыятар стаханаўскіх металаў працы ў матальным цэху, вучыць новых работніц, дапамагаючы ім стаць стаханаўкамі.

У 1936 годзе Лісунова ўступіла ў групу спачуваючых. Яна вядзе актыўную грамадскую работу, выбрана прафоргам брыгады, вучыцца і расце на рабоце.

Ніна Лісунова вырасла на нашай фабрыцы. Мы ўпэўнены, што яна апраўдае на вялікай адказнай работе годнасць дэпутата Совета Нацыянальнасцей Вярхоўнага Совета СССР.

Кейля КУРЧЫК, Хая ЛАБОВІЧ,
комсамолкі фабрыкі штучнага валакна імя Куйбышэва, г. Магілеў.

Нікіта БАТОЎКІН

Нікіту Ермалаевіча Батоўкіна даўно ведае сялянства нашага сельсовета, як энергічнага чалавека, старога калгасніка, які з першага дня ўступлення ў калгас змагаўся за ўмацаванне калгаснага ладу.

Нікіта Ермалаевіч з першых дзён арганізацыі калгаса заваяваў любоў і давер'е калгаснікаў. У яго надзейныя рукі аддалі самы адказны ўчастак у калгасе—догляд за коньмі. Нікіта Ермалаевіч падабраў для работы на канюшні надзейных людзей і забяспечыў добры догляд за коньмі.

Адданай прапай па сваім участку тав. Батоўкін у 1935 годзе дабіўся таго, што ад 46 конематак ён вырасціў 46 жарабят. За такую працу тав. Батоўкін, як знатны конюх, быў узнагароджан ордэнам Леніна.

Здаровае конскае паталоўе значна садзейнічала росту заможнасці нашага калгаса.

Нікіта Ермалаевіч Батоўкін цалкам апраўдае давер'е народа і будзе добрым і актыўным дэпутатам Вярхоўнага Совета СССР.

Я заклікаю ўсіх выбаршчыкаў Клімавіцкай выбарчай акругі аддаць свае галасы за лепшага конюха тав. Батоўкіна.

СКАЛЬЗАЕЎ Е. С.,
старшы конюх калгаса «Акцябр», Прапойскага раёна.

Сяргей МАКАРЭНКА

З вялікай радасцю я даведаўся, што мой аднавясковец Сяргей Парфенавіч Макарэнка будзе балатыравацца ў дэпутаты Совета Саюза па Горацкай выбарчай акрузе.

Тав. Макарэнку я ведаю як добрага сына нашай радзімы. Працуючы трактарыстам Крычаўскай МТС, ён стаў знатным чалавекам. За ўзорную работу ён быў некалькі разоў узнагароджаны.

У дзень выбараў я з задавальненнем апушчу свой бюлетэнь у урну за тав. Макарэнку і заклікаю ўсіх выбаршчыкаў галасаваць за яго.

Я ўпэўнены, што тав. Макарэнка з гонарам апраўдае аказанае яму працоўнымі вялікае давер'е.

М. С. ДОЛЬНІКАЎ.

Дзмітрый МАРКІН

На сваім перадвыбарчым сходзе мы, работнікі службы шляху ст. Калінкавічы, вылучылі кандыдатам у дэпутаты Совета Нацыянальнасцей тав. Маркіна Дзмітрыя Фёдаравіча, выконваючага абавязкі сакратара Мазырскага акруткома партыі.

Чаму мы вылучылі тав. Д. Ф. Маркіна сваім кандыдатам у вышэйшы орган улады нашай краіны? А таму, што мы ведаем: тав. Маркін, працуючы ў Ленінградзе на адказных партыйных пасадах, праявіў сябе як добры кіраўнік і барацьбіт з трацкісцка-зіноўеўскай поганню. Тав. Маркін працаваў і гартаваўся над кіраўніцтвам незабыўнага Сергея Міронавіча Кірава. І зараз ЦК партыі прыслаў яго да нас для ўмацавання акруговай партыйнай арганізацыі, для дапамогі ў ліквідацыі вынікаў шкодніцтва, нанесенага ворагамі народа.

Мы не сумняваемся, што тав. Маркін з чэсцю выканае ўскладзеную на яго партыяй задачу. Свой голас я аддам за тав. Маркіна — вернага сына нашай комуністычнай партыі.

КАВАЛЕНКА ФЁДАР ІВАНАВІЧ,
малатабоец майстэрні службы шляху ст. Калінкавічы.

ПАД СЦЯГАМ СТАЛІНСКАЙ КАНСТЫТУЦЫІ

Дзень 5 снежня 1936 года назаўсёды астанецца ў памяці чалавецтва: у гэты дзень Надзвычайны VIII З'езд Советаў Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік па дакладу вялікага правадыра народаў таварыша Сталіна зацвердзіў праект новай Канстытуцыі СССР, замацоўваючай перамогу соцыялізма ў СССР, Канстытуцыю свабоднага, шчаслівага жыцця совецкага народа. «У рэзультаце пройдзенага шляху барацьбы і ліпшэнняў прыемна і радасна мець сваю Канстытуцыю, якая трактуе аб плодах нашых перамог, — гаварыў таварыш Сталін у сваім гістарычным дакладзе на гэтым з'ездзе 25 лістапада. — Прыемна і радасна ведаць, за што біліся нашы людзі і як яны дабіліся сусветна-гістарычнай перамогі. Прыемна і радасна ведаць, што кроў, багата пралітая нашымі людзьмі, не прайшла даремна, што яна дала свае рэзультаты. Гэта ўзбройвае духоўна наш рабочы клас, наша сялянства, нашу прапоўную інтэлігенцыю. Гэта рухае наперад і ўзнімае пачуццё законнай гордасці. Гэта ўмацоўвае веру ў свае сілы і мабілізуе на новую барацьбу для завяавання новых перамог комунізма».

***

Толькі з устанаўленнем дыктатуры пролетарыята ўпершыню ў гісторыі перамагла сапраўдная дэмакратыя працоўных мас. Совецкая ўлада замацавала ў Канстытуцыі РСФСР 1918 года дыктатуру пролетарыята — новы, вышэйшы тып дэмакратыі.

Ленін і Сталін былі творцамі першай совецкай Канстытуцыі, імі былі напісаны асноўныя яе палажэнні.

У першай совецкай Канстытуцыі была абвешчана гістарычная задача дыктатуры перамогшага і стаўшага ва ўладзе пролетарыята—пабудова бясклассавага грамадства.

Канстытуцыя РСФСР, прынятая ў 1918 годзе на пятым Усерасійскім З'ездзе Советаў, дзейнічала да 1924 года і адыграла велізарную гістарычную ролю. Мільёны рабочых і бяднейшых сялян практычна вучыліся ў советах — органах дыктатуры пролетарыята — дзяржаўнай рабоце.

31 студзеня 1924 года другі З'езд Советаў СССР запвердзіў новую Канстытуцыю, распрацаваную пад кіраўніцтвам таварыша Сталіна.

Канстытуцыя 1924 года запверджвала СССР як адзіную саюзную дзяржаву, аснаваную на адзінстве інтарэсаў працоўных розных нацый, насяляючых яго. У той-жа час забяспечваўся суверэнітэт (дзяржаўная самастойнасць) кожнай саюзнай рэспублікі з правам свабоднага выхаду з Саюза.

Як і першая совецкая Канстытуцыя, Канстытуцыя СССР 1924 года была асноўным законам дыктатуры пролетарыята.

Абстаноўку, у якой наралілася Канстытуцыя 1924 года, таварыш В. М. Молатаў ахарактарызаваў у сваім выступленні на Надзвычайным VIII Усесаюзным З'ездзе Советаў:

«Тады мы яшчэ не маглі гаварыць аб перамозе соцыялізма ў нашай краіне. Пытанне «хто каго» яшчэ не было вырашана. Соцыялістычная гаспадарка была ў перыядзе ўзлыму, і яе перавага ўжо намецілася, але раслі яшчэ і капіталістычныя элементы, а ў вёсцы панавала дробнаўласніцкая гаспадарка, — вайбольш буйны астатак разбітага капіталізма».

У гэтых умовах вялікі стратэг пролетарскай рэволюцыі таварыш Сталін з геніяльнай празорлівасцю сфармуляваў гістарычную праграму індустрыялізацыі краіны і калектывізацыі сельскай гаспадаркі. Пад кіраўніцтвам вялікага Сталіна народы Совецкага Саюза з гонарам выканалі гэтую гістарычную праграму, забяспечыўшую поўную і безразлітоўную перамогу соцыялізма ў нашай краіне.

У баях супроць прэзрэннай банды трацкістаў і бухарынцаў таварыш Сталін адстаяў і развіў ленінскае вучэнне аб магчымасці пабудовы соцыялізма ў адной краіне, якое ўзбройвала рабочы клас і прапоўныя масы баявой праграмай барацьбы, непахіснай воляй да перамогі.

Пад слаўным кіраўніцтвам ленінска-сталінскага ЦК ВКП(б) «нашае совецкае грамадства дабілася таго, што яно ўжо ажыццявіла ў асноўным соцыялізм, стварыла соцыялістычны лад, г. зн. ажыццявіла тое, што ў марксістаў называецца інакш першай або ніжэйшай фазай комунізма» (Сталін).

Эксплаататарскія класы ліквідаваны, створана грамадства, якое складаецца з двух прыязных класаў, значна расшырана база дыктатуры пролетарыята.

У 1937 годзе класавы склад насельніцтва СССР такі: рабочыя і служачыя складаюць разам 34,7 проц., калгаснае сялянства, кааперацыя саматужнікі і рамеснікі — 55,5 процанта, сяляне-аднаасобнікі — 5,6 процанта, іншае насельніцтва — навучаючыяся, пенсіянеры, Чырвоная Армія і так далей — 4,2 процанта. (У 1913 годзе эксплаататарскія класы — буржуазія, памешчыкі, гандляры, кулакі — складалі значную групу насельніцтва — 15.9 процанта).

Новая Канстытуцыя, прынятая Надзвычайным VIII З'ездам Советаў Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік аблюстравала перамогу соцыялізма ў СССР, і таму совецкі народ па праву назваў яе Сталінскай Канстытуцыяй перамогшага соцыялізма.

***

Канстытуцыі буржуазна-дэмакратычных краін толькі фармальна абвяшчаюць тыя ці іншыя правы і свабоды грамадзян. Штодзённы практычны вопыт прапоўных капіталістычных краін пераконвае іх, што ў свеце эксплаататары гэтыя правы існуюць толькі для багатых. Лёс прапоўных капіталістычнага грамадства — бязлітасная эксплаататарыя.

У Сталінскай Канстытуцыі — самай дэмакратычнай у свеце — абвешчаны і гарантаваны народжаныя перамогай соцыялізма вялікія правы прапоўных СССР: права на працу, на адпачынак на асвету, матэрыяльнае забеспячэнне на старасці.

Лозунг «Права на працу» быў заўсёды напісаны на спягах змагаючагася эксплаатуемага чалавецтва, заўсёды з'яўляўся выражэннем пратэсту супроць капіталістычнай эксплаатацыі. Лепшыя розумы чалавецтва на працягу многіх вякоў марылі аб такім грамадстве, у якім чалавек будзе забяспечаны працай, будзе мець права на працу.

Аднак, «Права на працу ў буржуазным сэнсе ёсць бяссэнсіца, нікчэмнае благачасцівае пажаданне» (Маркс). Капіталізм і права на працу — рэчы несумяшчальныя, бо без пастаяннай армії беспрапоўных капіталізм не можа абыйсціся. У сучасны момант, па афіцыйных далёка няпоўных даных, у Злучаных Штатах Амерыкі 10 мільёнаў беспрапоўных, у фашысцкай Германіі — больш 3 мільёнаў, у Англіі—2 мільёны. Армія беспрапоўных у капіталістычных краінах безупынна папаўняецца мільёнамі разарыўшыхся сялян, бо асноўным законам развіцця вёскі ва ўмовах капіталізма з'яўляецца безупынны працэс разарэння большасці сялян і ўзбагачэння нязначнай іх меншасці.

Новы эканамічны крызіс, які няўмольна насоўваецца ў краінах капіталізма, нясе новыя нелічоныя бядоты прадолжаму і эксплаатуемаму чалавецтву.

Толькі ліквідацыя капіталізма і поўная перамога соцыялізма, падрыхтаваныя і ажыццёўленыя шматгадовай барацьбой ленінска-сталінскай партыі, далі шчаслівым прапоўным СССР рэальнае права на працу, абвешчанае Сталінскай Канстытуцыяй. У сучасны момант колькасць рабочых і служачых у Совецкім Саюзе вырасла да 26,3 мільёна чалавек (супроць 11,6 млн. у 1928 годзе).

Але Сталінская Канстытуцыя не толькі абвясціла правы грамадзян.

«Асаблівасць праекта новай Канстытуцыі, — гаварыў таварыш Сталін на Надзвычайным VIII Усесаюзным З'ездзе Советаў,—заключаецца ў тым, што ён не абмяжоўваецца фіксаваннем фармальных правоў грамадзян, а пераносіць цэнтр цяжару на пытанне аб гарантыях гэтых правоў, на пытанне аб сродках ажыццяўлення гэтых правоў... ён не проста абвяшчае права на працу, але і забяспечвае яго законалаўчым замацаваннем факта адсутнасці крызісаў у совецкім грамадстве, факта знішчэння беспрапоўя».

Лепшая ілюстрацыя гэтаму — сталінскія клопаты аб совецкай жанчыне, якая не толькі фармальна ўроўнена ў правах з мужчынам, але мае ўсе магчымасці ажыццявіць сваё права на працу. У краіне створана выключная па сваіх размерах сетка ўстаноў па абслугоўванню матцеры і дзіцяці. І не выпадкова, што ў сучасны момант жанчыны складаюць больш трэці (9 мільёнаў) усёй масы рабочых і служачых нашай краіны.

Наш совецкі рабочы працуе ў 4 разы больш прадукцыйна, чым рабочы дарэвалюцыйнай Расіі. Свабодная праца ў нашай краіне соцыялізма стала справай славы, справай гонару, справай доблесці і геройства.

Сталінскімі клопатамі аб чалавеку прасякнуты кожны артыкул вялікай Канстытуцыі. Грамадзяне СССР маюць рэальнае права на адпачынак, на асвету, на матэрыяльнае забеспячэнне на старасці.

***

Нябачаным узлётам палітычнай актыўнасці прапоўных мас горада і вёскі сустрэла краіна прыняцце Сталінскай Канстытуцыі. Гэта знайшло сваё яркае выражэнне ў агульным працоўным узлёце, у бурным развіцці стаханаўскага руху, соцыялістычнага спаборніцтва.

Разгром асноўных гнёзд японска-германа-трацкісцка-бухарынскіх шпіёнаў, здрадзнікаў, дыверсантаў, шкоднікаў стварыў новыя магчымасці для гаспадарчага развіцця краіны, намнога ўзмацніў яе магутнасць.

1937 год, які зараз канчаецца, з'яўляецца годам новых буйнейшых дасягненняў соцыялістычнай эканомікі. У 1937 годзе кошт прадукцыі нашай прамысловасці ў 8 разоў перавысіць мінаўшчыны.

Неабходна напомніць, што тры чвэрці ўсёй прамысловай прадукцыі СССР даюць зараз заводы, пабудаваныя совецкай уладай.

1 красавіка 1937 года — на 9 месяцаў раней тэрміну—быў выканан другі пяцігадовы план прамысловасці СССР. Рабочы клас Совецкага Саюза, пад геніяльным кіраўніцтвам таварыша Сталіна, прарабіў велізарнейшую творчую работу па тэхнічнай рэканструкцыі народнай гаспадаркі.

Багатым ураджаем у 1937 годзе адказвае калгасная вёска на Сталінскую Канстытуцыю. Стаханаўскі рух у калгасах краіны вырас у магутную сілу, вылучыўшы многія сотні вядомых усёй краіне рэвалюцыянераў і наватараў ва ўсіх галінах калгаснай вытворчасці.

Багаты калгасны ўраджай бягучага года, які ў паўтара раза перавышае летапісні, паўсямесны рост ураджайнасці, ужо значна пераўзыходзячай ураджайнасць дарэвалюцыйнай Расіі, — усё гэта прамы рэзультат новага, народжанага Сталінскай Канстытуцыяй, палітычнага ўздыму калгаснага сялянства, якое «базіруе сваю работу і сваё дастаўленне не па аднаасобнай працы і адсталай тэхніцы, а на калектыўнай працы і сучаснай тэхніцы» (Сталін).

***

Гадавіну гістарычнага дня — 5 снежня краіна соцыялізма святкуе напярэдадні вялікай падзеі ў жыцці народаў СССР — выбараў у Вярхоўны Совет СССР.

Грамадзяне вялікай соцыялістычнай дзяржавы 12 снежня выберуць свой вярхоўны орган па самаму дэмакратычнаму ў свеце парадку, абвешчанаму Сталінскай Канстытуцыяй, — шляхам усеагульных, роўных і прамых выбараў, пры тайным галасаванні.

Нябачаная палітычная актыўнасць совецкіх выбаршчыкаў — лепшы доказ сапраўднай соцыялістычнай дэмакратычнасці выбараў у СССР. Перад усім светам соцыялістычная дзяржава дэманструе несакрушальнае палітычнае і маральнае адзінства свайго народа, звязанага непарушнай сувяззю з сваім перадавым атрадам—роднай комуністычнай партыяй, згуртаванага вакол правадыра народаў таварыша Сталіна. Мільёны працоўных вылучылі творца Канстытуцыі таварыша Сталіна і яго саратнікаў першымі кандыдатамі ў дэпутаты Вярхоўнага Совета СССР.

Няма ў свеце сілы, здольнай спыніць пераможны рух совецкага народа. Як з шалёнымі сабакамі распраўляцца вялікі совецкі народ з подлымі наймітамі японска-германскага фашызма—трацкісцка-бухарынскімі шпіёнамі і правакатарамі. Апіраючыся на дапамогу народа, слаўныя наркамунутдзельцы на чале з сталінскім вучнем Н. І. Ежовым разграмілі асноўныя гнёзды заклятых ворагаў народа. Узброеныя Сталінскай Канстытуцыяй, народы СССР ачышчаць да канца совецкую зямлю ад фашысцкай нечысці, знішчаць усіх да аднаго ворагаў соцыялізма.

Няхай жыве вялікая Сталінская Канстытуцыя перамогшага соцыялізма!

ДЭКАДА ВЫДАТНАЙ ФІНАНСАВАЙ РАБОТЫ

Следуючы прыкладу стахановаў Сталінскай выбарчай акругі гор. Масквы аб арганізацыі сталінскай дэкады стахановскіх рэкордаў, работнікі цэнтральных і раённых ашчадкас Менска, Гомеля і Талачына прапанавалі правесці дэкаду выдатнай фінансавай работы па сістэме ашчадкас і дзяржкрэдыту БССР.

Кіраўніцтва ашчадкас і дзяржкрэдыту БССР і прэзідыум ЦК саюза фінансава-банкаўскіх работнікаў ухвалілі гэта мерапрыемства па дастойнай сустрэчы дня выбараў у Вярхоўны Совет СССР. Па ўсей сістэме ашчадкас і дзяржкрэдыта БССР з 2 па 12 снежня праводзіцца дэкада выдатнай фінансавай работы.

Кожная ашчадкаса ставіць сваёй мэтай дабіцца ка дня выбараў стопроцантнага ўнясення калгаснікамі грошай па пазіцыі на пазыку «Умацавання абароны СССР», выканання квартальнага плана па пазыцы і ўкладах па гораду і вёсцы, павелічэння колькасці ўкладчыкаў у ашчадкасах і г. к.

Для заахвочання лепшых ашчадкас, іх загадчыкаў, інспектароў, работнікаў апарата, фінансавых актывістаў горада і вёскі ўстаноўлены наступныя прэміі: для ашчадкасы — пераходны чырвоны сцяг, для работнікаў — ганаровыя граматы, 10 пупёвак у дамы ашчадкнку і г. к.

ДАКЛАД таварыша СТАЛІНА НА ЭКРАНЕ

5 і 6 снежня ў менскім кінатэатры «Чырвоная зорка» будзе дэманстравацца гукавы фільм «Даклад таварыша Сталіна аб праекце Канстытуцыі ВС Надзвычайным VIII Усесаюзным З'ездзе Саветаў».

Апрача таго глядачам будзе паказан спецыяльны выпуск кінохронікі Белдзяржкіно, прысвечаны кандыдату ў дэпутаты Вярхоўнага Совета ад Менскай выбарчай акругі таварышу К. Е. Варашылаву. У кінохроніцы аллюстроўваюцца моманты з біяграфіі жалезнага наркома абароны, выступленне таварыша Варашылава на манеўрах, парад Чырвонай Арміі і т. д.

КОМСАМОЛЬСКА-МАЛАДЗЁЖНАЕ ФАКЕЛЬНАЕ ШЭСТВІЕ

6 снежня вечарам у гонар гадавіны Сталінскай Канстытуцыі і выбараў у Вярхоўны Совет у Менску наладжваецца комсамольска-маладзёжнае факельнае шэствіе. У ім прымуць удзел каля 30 тысяч комсамольцаў, маладых рабочых, работніц, студэнтаў і вучняў старэйшых класаў.

Калоны з аркестрамі музыкі, партрэтамі правадыроў, лозунгамі, плакатамі пройдуць міма плошчы імя Леніна.

Шэствіе адкрые калона моладзі Сталінскага раёна.

ВЫСТУПЛЕННІ ПІСЬМЕННІКАЎ НА ВЫБАРЧЫХ УЧАСТКАХ

Праўленне Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР вылучыла групу пісьменнікаў з 13 чалавек для выступленняў у дзень гадавіны Сталінскай Канстытуцыі на выбарчых участках Менска. Сёння на выбарчых участках №№ 49 і 62 выступаюць з чытаннем сваіх твораў, прысвечаных кандыдату ў дэпутаты Вярхоўнага Совета СССР ад Менскай гарадской выбарчай акругі — жалезнаму наркому абароны таварышу К. Е. Варашылаву, пісьменнікі Брыўка, Александровіч, Агняцвет, Куляшоў, Хведаровіч і інш.

З 12 ПЕСЕНЬ АБ К. Е. ВАРАШЫЛАВУ

Музыка І. ЛЮБАНА



Быў слесар луганскі,
А сталь ён каваў
І песні-вяснянкі
Пра волю спяваў.

І слухалі песню
Заводы і бор,
Імчаў яе вецер,
Адносіў віхор.

Іскрыліся ў горне
Агніста вуглі,
А іскры далёка
Ляцець не маглі.

Біў молат магутна,
Як гора, як гнеў,
Кавала звінела
І молат звінеў.

І кузня звінела,
І слухала даль...
І выкаваў волю,
Як іскру, як сталь.

ЛЫЖНА-ЗВЁЗДНАЯ ЭСТАФЕТА, ПРЫСВЕЧАНАЯ ВЫБАРАМ У ВЯРХОЎНЫ СОВЕТ СССР

Сёння ў БССР пачынаецца рэспубліканская лыжна-звёздная эстафета, прысвечаная гадавіне Сталінскай Канстытуцыі і выбарам у Вярхоўны Совет СССР. У эстафеце прымаюць удзел 300 фізкультурнікаў-агітатараў, якія наведаюць рад выбарчых округ.

З Менска лыжная агітбрыгада з лепшых фізкультурнікаў — студэнтаў інстытута народнай гаспадаркі імя Куйбышэва — накіруецца на маршруту Менск—Смілавічы—Чэрвень—Барысаў.

З Віцебска 5 каманд ідзе па маршруту да Оршы. Аршанскія лыжнікі пойдуць па напрамку Талачын—Магілеў. Каманды Магілева будуць следаваць па маршруту Бялынічы—Бярэзіно з фінішам у Асіпавічах і т. д.

Лыжнікі-агітатары ў пуці следавання будуць праводзіць гутаркі аб Сталінскай Канстытуцыі і агітаваць за вылучаных выбарчымі акругамі кандыдатаў у дэпутаты Вярхоўнага Совета.

НОТА ПРАТЭСТУ ПАВЕРАНАГА Ў СПРАВАХ СССР У ПОЛЬШЧЫ тав. ВІНАГРАДАВА

ВАРШАВА, 3 снежня (БЕЛТА). Сёння паверанны ў справах СССР у Польшчы тав. Вінаградаў наведаў міністэрства замежных спраў і ўручыў ноту пратэсту з поваду правакацыйнай выхадкі польскай ваеннічыны, арганізаваўшай на польскай пагранічнай станцыі Здалбунава налёт і нападзе совецкага поезда, які вяртаўся з Польшчы ў СССР.

У ноце паўпрэдства СССР у Польшчы ўказваецца, што яшчэ 22 лістапада г. г. тав. Вінаградаў у гутарцы з дырэктарам Усходняга дэпартамента міністэрства замежных спраў паведаміў яго аб радзе грубых выпадаў польскіх улад у адносінах да брыгад паездоў, якія ідуць з СССР да Здалбунава, і патрабаваў змены рэжыму ў дачыненні да совецкіх чыгуначнікаў. Далей нота ўказвае, што, не гледзячы на гэтае прадстаўленне, 29 лістапада на станцыі Здалбунава разыграўся новы інцыдэнт, які па сваёй сур'ёзнасці перавышае ўсе папярэднія.

Вылажыўшы асноўныя факты, што датычаць бясчынстваў польскага канвою, збівання совецкага чыгуначніка і нападу вагона совецкага поезда па дарозе са Здалбунава ў СССР, паўпрэдства заяўляе рашучы пратэст і патрабуе строгага пакарання вінаватых ва ўчыненні ўказаных дзеянняў.

Апрача таго, паўпрэдства ўскладае матэрыяльную адказнасць за нанесеныя страты на польскі ўрад і патрабуе прыняцця неабходных мер для прадухілення падобных інцыдэнтаў у далейшым.

НОТА ІСПАНСКАГА ЎРАДА АНГЛІІ

ПАРЫЖ, 3 снежня. (БЕЛТА). Па паведамленню агенцтва Гавас з Барселоны, іспанскае міністэрства замежных спраў апублікавала адказную ноту англійскаму ўраду па пытанню аб пасылцы ў Іспанію камісіі для вывучэння ўмоў «адклікання добраахвотнікаў». У ноце гаворыцца:

«Іспанскі ўрад некалькі месяцаў назад унёс прапанову аб адкліканні з Іспаніі замежных байцоў, і ён прадаўжае цвёрда адстайваць свой пункт гледжання. У сувязі з гэтым іспанскі ўрад выказвае згоду і ўхваленне па поваду правядзення гэтай операцыі пад міжнародным наглядам. Ён згодзен таксама на прыезд камісіі ў Іспанію».

Разам з тым, гаворыцца далей у ноце, неабходна ўдакладніць змест паняцця «замежныя байцы». Лонданскі камітэт устанавіў, што адкліканне байцоў неіспанскага паходжання будзе правядзена па частках і прапарцыянальна ліку замежных байцоў, якія знаходзяцца ў абодвух лагерах. Аднак камітэт нічога не сказаў адносна таго, ці маецца на ўвазе ў пытанні аб прапарцыянальнасці толькі колькасць байцоў, або падразумяваюцца розныя катэгорыі тэхнічных саветнікаў, якія знаходзяцца ў абодвух лагерах.

У ноце ўказваецца далей, што іспанскі ўрад выказвае вялікае здзіўленне па поваду таго, што ў праекце аб адкліканні замежных байцоў Лонданскі камітэт не разглядае ў якасці таказых падданых Марока, пражываючых у зоне іспанскага пратэктарата, устаноўленага ў гэтай дзяржаве.

Іспанскі ўрад лічыць неабходным, каб рэзалюцыя Лонданскага камітэта, якая ўпаўнаважвае старшыню камітэта звяркуцца да іспанскага ўрада, а таксама да мяцежнікаў была-б удакладнена ў наступным: ці адносіцца такое пагадненне выключна да адклікання асоб неіспанскай нацыянальнасці, прымаючых удзел у вайне, або яно распаўсюджваецца таксама на іншыя праблемы, як-та: праблема прызнання правоў ваюючай стараны і праблема ўстанаўлення сухаземнага і марскога кантролю.

НА ФРАНТАХ У ІСПАНІІ

МАДРЫДСКІ ФРОНТ

У сектары Гвадалахары (на паўночны ўсход ад Мадрыда) мяцежнікі атакавалі 3 снежня рэспубліканцаў упоблізу Дос Аройос і Паланцарэс, але былі адбіты.

Раніцою 3 снежня мяцежнікі падвергці артылерыйскай бамбардыроўцы Мадрыд.

На астатніх франтах без змен.

ДЗЕЯННІ АВІЯЦЫІ

3 снежня 20 рэспубліканскіх бамбардыроўшчыкаў, суправаджаемых трыма эскадрыллямі знішчальнікаў, бамбардыравалі ваенныя базы мяцежнікаў у Альмудэвары і скапленні войскаў мяцежнікаў у Фуэнтэс дэ Эбро, пасля чаго без страт вярнуліся на свае базы.

Мяцежнікі падвергці паветранай бамбардыроўцы дзве вёскі на паўднёвы ўсход ад Мадрыда.

3-га снежня авіяцыя мяцежнікаў прабавала, зрабіць налёты на Барселону, але, была адбіта. Самалёты мяцежнікаў, заручаючыся, скінулі бомбы па дзве вёскі ў правінцыі Тарагона. Рэспубліканская авіяцыя збіла адзін з гідрасамалётаў мяцежнікаў, прымаўшых удзел у налёце на Барселону. Ён затануў у моры. (БЕЛТА).

НАТХНІЦЕЛІ ФАШЫСЦКАЙ ЗМОВЫ—ПАД АПЕКАЙ КІРУЮЧЫХ КОЛАЎ ФРАНЦЫІ

ПАРЫЖ, 3 снежня. (БЕЛТА). У ходзе следства па справе аб фашысцкай змове ва Францыі знойдзен дакумент, які сведчыць аб тым, што ваенныя падрыхтаванні змоўшчыкаў да фашысцкага перавароту пачаліся яшчэ да таго, як быў прыняты закон аб роспуску фашысцкіх ліг.

Грамадская думка выражае недаўменне, чаму да гэтага часу не названы і не арыштаваны сапраўдныя натхніцелі змовы, тыя, хто павінны былі-б стаць на чале дыктатуры, устанаўленне якой рыхтавалі змоўшчыкі. Усё часцей грамадскай думкай называецца вяломы правы дзеяч Тард'е ў якасці такога «кандыдата ў дыктатары». Характэрна, між іншым, прыватзімае рэакцыйнай газетай «Эко дэ Пары» паведамленне адносна Тард'е. Па словах газеты, міністэрствам унутраных спраў было ўжо паслана распараджэнне адносна допыту Тард'е, але гэта распараджэнне быццам было адменена па спешнай дырэктыве, атрыманай з канцылярыі главы ўрада.

«Юманітэ» прыводзіць новыя цікавыя даныя адносна бегства з Францыі барона фон Потэрса, агента гітлераўскага Гестапо (германская тайная паліцыя).

Газета ўказвае, што спецыяльны пропуск фон Потэрсу быў выдан французскай палітычнай паліцыяй. Ён адпраўляўся ў Берлін з сакрэтнымі данымі, якія датычаць французскай нацыянальнай абароны, і ўзамен ён даставіў французскай палітычнай паліцыі якіясьці весткі з Германіі.

ВАЕННЫЯ ДЗЕЯННІ Ў КІТАЕ

НА ШАНХАЙСКІМ ФРОНЦЕ

ХАНЬКОЎ, 4 снежня. (БЕЛТА). Вечарам 3 снежня, па вестках агенцтва Сентрал Ньюс, японцамі ўзяты Цзянь-Інь. У кітайскіх ваенных колах адзначаюць, што абарона Цзян-Іня дала магчымасць кітайскаму камандаванню стварыць новыя загароды ў некалькіх мясцах ракі Янцзы. Раніцою 3 снежня японскія войскі ўступілі ў Даньян.

Як цяпер стала вядома, горад Чанчжоу быў заняты японцамі 1 снежня. Па-



лы тылзень кітайскія войскі, паказваючы прыклады гераізму і стойкасці, абаранялі горад. Прыкрываўшы адыход кітайскіх войск, батальён кітайскіх салдат затрымліваў доўга японцаў, і толькі 20 салдат са складу батальёна асталіся жывымі і накінулі горад. Японцы страцілі па Чанчжоу забітымі і ранепымі не менш 1.000 чалавек і ўступілі ў горад, паляраўне ператварыўшы яго ў груды развалін.

Раніцою 3 снежня больш 20 кітайскіх самалётаў зрабілі нечаканы налёт на японскія базы ў Усуне (Шанхай).

Пашкоджана 5 японскіх ваенных караблёў на рэйдзе Вампу.

3-га снежня японцы разграмілі незалежлікі гарадок Сяошань (паблізу ад Ханчжоу). Перапоўнены бежанцамі горад быў падвергнуты жорсткай бамбардыроўцы паветра. Паводле папярэдніх падлікаў, загінула звыш 500 чалавек. Праз дзень японскія лётчыкі разграмілі яшчэ адзін мірны горад — Чжэнцзян (у цэнтры правінцыі Чжэцзян). 700 чалавек забіты і 600 паранена. Загінула многа дзяцей.

***

ШАНХАЙ, 4 снежня. (БЕЛТА). Учора з 1 гадзіны дня да 10 гадзін вечара цэнтральная частка міжнароднага сетлемента (квартала) Шанхая знаходзілася пад кантролем японскіх войскаў і жандармерыі. Тулы не капускаліся не толькі кітайцы і іншаземныя жыхары, але і англійскія афіцэры. Японскімі патрулямі быў спынен атрад англійскіх салдат і прапушчан толькі пасля працяглых перагавораў. На двух вуліцах японскія патрулі, разганяючы публіку, накіравалі штыхі на групу іншаземцаў. Пачалася бойка, якую ўдалося ліквідаваць, дзякуючы ўмяшанню муніцыпальнай паліцыі. Не глядзячы на ўход японцаў з цэнтральнага часткі міжнароднага сетлемента, настрой горадзе вельмі трывожны.

СЁННЯ Ў ТЭАТРАХ І КІНО:

Белдзяржрамтэатр — «Салавей»; Дзяржаўны яўрэйскі тэатр — «Грошы»; Дзяржаўны тэатр юнага гледача — «Як гартавалась сталь». У кінатэатрах: «Чырвоная зорка» — Даклад таварыша Сталіна І. В. аб праекце Канстытуцыі Саюза ССР на Надзвычайным VIII Усесаюзным З'ездзе Саветаў 25 лістапада 1936 г. (гукавы фільм); «Пролетарый»—«Зняволеныя»; Дзіцячы гукавы кінатэатр — «Радама кліча»; «Інтэрнацыянал» — «Неўстрашымыя»; «Спартак» — «На далёкім Усходзе».

ДВА СВЕТЫ—ДЗВЕ СІСТЭМЫ

Год таму назад Надзвычайны VIII Усесаюзны З'езд Саветаў канчаткова зацвердзіў зялёную хартыю перамогшага сацыялізма — Сталінскую Канстытуцыю.

У 1935 годзе, калі ў рэзультаце перамог сацыялізма, па ініцыятыве таварыша Сталіна, было пастаўлена пытанне аб змешах у Канстытуцыі СССР, у той час польская буржуазія паднесла «падарунак» польскаму народу — сваю новую рэакцыйна-фашысцкую канстытуцыю.

Сталінская Канстытуцыя — прамы рэзультат слаўнага гістарычнага шляху, пройдзенага народамі нашай краіны пад кіраўніцтвам партыі Леніна — Сталіна, шляху адвагі і гераізма, дасягненняў і перамог. Канстытуцыя СССР — рэзультат пераўтварэння нашай краіны ў краіну сацыялізма, краіну высокай індустрыі, перадавога сацыялістычнага земляробства, краіну растучай культуры і заможнасці ўсіх працоўных.

Польская канстытуцыя 1935 года — гэта акт фашысцкага гвалту над народам. Новая польская канстытуцыя канчаткова скасавала старую, заснаваную на былых буржуазна-дэмакратычных традыцыях, канстытуцыю 1921 года, якая, між іншым, ніколі польскай буржуазіяй не ажыццяўлялася.

18 год таму назад у абстаноўцы рэвалюцыйнай буры, дзякуючы перамозе Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі ў Расіі, узнікла польская дзяржава. Працоўным Польшчы нехапіла сіл, каб звярнуць эксплаататараў і заверадзіць сваё панаванне. Гэта выкарысталі капіталісты і памешчыкі і з дапамогаю польскіх сацыялістаў (ППС) і іншых згоднікаў захапілі ўладу ў свае рукі. Напалоханая масавым рэвалюцыйным рухам таго часу, польская буржуазія дэкларавала рад дэмагагічных абяцанняў пролетарыяту і сялянству. Сакавіцкая канстытуцыя 1921 года праклямавала, што «вярхоўная ўлада належыць народу», «жыллё грамадзяніна недатыкальна», абвясціла «права на дзяржаўную ахову працы» і т. д.

Няма чаго і гаварыць, што ўсе гэтыя гарантыі «працы» і «свабоды» былі ў адносінах працоўных простым ашуканствам. Пад слозамі «ўлада належыць народу» польскія паны разумелі толькі саміх сябе. «Недатыкальнасць жылля» датычылася толькі асабнякоў капіталістаў і памешчыкаў. Рэвалюцыйныя рабоча-сялянскія арганізацыі, комуністычная партыя былі загнаны ў падполле з першага-ж дня ўзнікнення Польшчы. Гвалт над мільённымі масамі прыгнечаных народаў Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны ўзаконіла якраз першая «дэмакратычная» польская канстытуцыя. Дэкларыраванага ў 1921 годзе 8-гадзіннага рабочага дня рабочыя так і не ўбачылі, хапя фармальна гэты закон існаваў 14 год. Замест абяцанай зямлі, сяляне атрымалі куцую зямельную рэформу, ад якой нажыліся толькі памешчыкі і ўмацаваліся кулакі.

Калі-ж рост класавай барацьбы і супярэчнасці ў лагеры самой буржуазіі стварылі пагрозу панаванню капіталістаў і памешчыкаў. Пілсудскі ў маі 1926 года ўстанавіў фашысцкую дыктатуру. Праўда, фармальна канстытуцыя 1921 года пасля фашысцкага перавароту не была скасавана, але на справе ад яе засталіся толькі... недатыкальнае права капіталістычнай уласнасці ды забяспечваючыя гэтае права фашысцкі штых і паліцэйскі бізун. У 1935 годзе была прынята новая канстытуцыя, якая аблавілае сутнасці фашысцкай дыктатуры і канчаткова грывае фігавыя лісткі, якімі прыкрывалася старая канстытуцыя.

Замест хлусліўых фраз аб уладзе народа, у гэтай канстытуцыі заяўляецца, што «ў асобе прэзідэнта скапцэнтроўваецца алзіная і недзялімая дзяржаўная ўлада». Прэзідэнт, па словах гэтай-жа канстытуцыі, адказны толькі... «перад богам і гісторыяй»: 12 і 13 параграфы новай польскай канстытуцыі вызначаюць функцыі і выключныя правы прэзідэнтаў у такіх размерах, у якіх вызначаецца роля германскага «фюрэра», італьянскага «дуче» або японскага «мікадо». Нават у тэксце прысягі не застаецца ні слова аб тым, што прэзідэнт адказны перад народам.

Абзяргаючы прынцыпы старой канстытуцыі—«роўныя правы для ўсіх грамадзян», прынцыпы, які, зразумела, ніколі не ажыццяўлялася ў капіталістычных краінах, новая польская канстытуцыя заяўляе, што правы грамадзяніна вымяраюцца «коштам намаганняў і паслуг грамадзяніна на карысць усеагульнага дабра». — чытай: на карысць буржуазіі. Алзін з аўтараў гэтай канстытуцыі, пяперашні віцэ-старшыня сейма Цар, дастаткова ярка выразіў імкненне буржуазіі канчаткова ахіліць народныя масы ад уплыву на дзяржаўны апарат, калі пісаў: «Факты маральнага характару і індывідуальнай вартасці чалавека, не гаворачы аб рэчах няважкіх, несумненна, адыгрываюць больш важную ролю, чым тупы аўтаматызм ліку». Не цяжка здагадацца, што ў разуменні польскіх фашыстаў «тупым лікам» з'яўляюцца прапоўныя масы, а «індывідуальнай вартасцю» ўладаюць капіталісты, памешчыкі і іх верныя фашысцкія паслугачы.

Велізарнейшай гарантыяй матэрыяльных правоў працоўных у СССР з'яўляецца сацыялістычная ўласнасць на сродкі вытворчасці, якая запэрдзілася ў выніку ліквідацыі капіталістычнай сістэмы гаспадаркі, скасавання прыватнай уласнасці на сродкі вытворчасці і знішчэння эксплаатацыі чалавека чалавекам.

Аўтары польскай канстытуцыі, баючыся больш за ўсё на свеце праяўлення волі народа рэвалюцыйнымі металамі, асабліва занепакоены за захаванасць капіталістычнай і памешчыцкай уласнасці. Такія артыкулы, як «Польская рэспубліка прызнае ўласнасць за алзін з важнейшых устояў грамадскага ладу і грамадскага парадку», або «Зямельны лад павінен грунтавацца на земляробчых гаспадарках..., складаючых прыватную ўласнасць» і т. п., з вялікай старанпасцю ўпісаны ў польскую канстытуцыю 1935 года.

Сталінская Канстытуцыя — алзіная ў свеце, якая гарантуе кожнаму совецкаму грамадзяніну права на працу, права на адпачынак, права на асвету і права на забяспечаную старасць. Канстытуцыя гарантуе кожнаму працоўнаму СССР праз актыўнага ўдзелу ў палітычным жыцці краіны і кіраванні дзяржавай.

Польская канстытуцыя 1935 года яшчэ больш узаконіла «права» працоўных на галоднае існаванне, «права» быць люта эксплаатуемым і прыгнятаемым. У Польшчы кожны другі рабочы—беспрапоўны. На вёсны, па выказванню самаго міністра земляробства Панятоўскага, ёсць 9 мільёнаў «лішніх рук». Галеча і голад у Польшчы маюць ужо сваю багатую літаратуру. Дастаткова азнаёміцца з вышаўшымі ў самой Польшчы «Запіскамі сялян», «Мемуарамі беспрапоўных» і т. д., каб уявіць сабе, у якіх жахлівых умовах жывуць прапоўныя горада і вёскі.

Адным з галоўных прынцыпаў польскай канстытуцыі з'яўляецца пераўтварэнне парламента (сейма) у фікцыю. Канстытуцыя поўнасцю ўзаконіла тое становішча, якое адзначаў тав. Молатаў у дачыненні да ўсіх фашысцкіх краін, дзе «парламенты яшчэ існуюць, па крайняй меры, у спіску дзяржаўных устаноў..., але на спразе іх ужо не прымаюць усур'ёз». Парламент у любы момант можа быць распушчаны «памазанікам божым»—прэзідэнтам. Прэзідэнт на любое рашэнне парламента можа накласці сваё «вета».

Але мала таго, што парламент ператвораны ў фікцыю. Новы польскі выбарчы закон поўнасцю пазбаўляе народныя масы ад уплыву на склад сейма і забяспечвае кіруючаму лагеру 100-процантны склад дэпутатаў. У сувязі з павышэннем ўзроснага цэнзу з 21 да 24 год і ўвядзеннем цэнзу асеўласці да алнаго года, выбарчых правоў пазбаўляецца ўся моладзь і велізарныя масы пролетарыята, вымушаныя ў пошуках заработку часта мяняць сваё месца жыхарства. Выбарчы закон прадастаўляе права намячаць кандыдатаў у дэпутаты толькі камісіям, якія складаюцца з прадстаўнікоў аб'яднанняў прамысловых і ганіляроў, памешчыкаў і кулакоў і фашысцкіх самакіраўніцтваў.

Выбары ў верхнюю палату — сенат — заснаваны на прынцыпу «эліты» (выбрэнікаў). У выбарах сенатараў могуць прымаць удзел толькі асобы, узнагароджаныя ордэнамі, саветнікі органаў фашысцкіх самакіраўніцтваў, гаспэлары прадпрыемстваў, дырэктары вышэйшых і сярэдніх школ і т. п. Але і яны не выбіраюць сенатараў прамым галасаваннем, а толькі прадстаўнікоў, якія на сваіх нарадах вылучаюць сенатараў. Аўтар алнаго з пісем, змешчаных у «Запісках сялян», паллічыў, што ў яго вёсцы, дзе каля 5 тысяч жыхароў, права выбіраць у сенат мелі толькі 4 чалавекі: памешчык, яго шафёр, загадчык школай і алзін кулак.

У нашай краіне, якая рыхтуецца да выбараў у Вярхоўны Совет СССР на аснове Сталінскай Канстытуцыі, адбываецца велізарны ўздым палітычнай актыўнасці выбаршчыкаў. Мільёны прымаюць удзел у абмеркаванні і вылучэнні сваіх кандыдатаў — большэвікоў, пазапартыйных і непартыйных, беззаветна адданых справе народа, справе Леніна—Сталіна. «Маральна-палітычнае алзінства народа ў нашай краіне,—гаварыў тав. Молатаў,—мае і сваё жывое ўвасабленне. У нас ёсць імя, якое стала сімвалам перамог сацыялізма. Гэтае імя, разам з тым, сімвал палітычнага алзінства совецкага народа. Вы зелаеце, што гэтае імя — Сталін».

Прапоўным масам Польшчы, «узнагароджаным» новай фашысцкай канстытуцыяй, застаўся толькі алзін сродак для выражэння сваёй волі, гэта — байкот выбараў. І гэтым сродкам яны шырока карысталіся, калі адбываліся выбары ў пяперашні польскі сейм. Даючы адпоўку гэтым выбарам, кансерватыўная газета «Час» у свой час пісала: «Мы не маем намеру ўтойваць, што слабы ўдзел у выбарах лічым вельмі непажаданым з'явішчам». Згодна «Часу», ална з галоўных прычын слабога ўдзелу ў выбарах «гэта алсутнасць дастатковай зацікаўленасці грамадства грамадскімі пытаннямі. Грамадства адчувае сябе бязвольным прадметам золі пануючых і не верыць, што можа хоць часткова стаць супрапоўнікам гэтай волі, не верыць, што яно магло-б мець які-небудзь уплыў на ход дзяржаўных спраў».

Узняць гэту «зацікаўленасць грамадскімі пытаннямі» не змагла і фашысцкая перадвыбарчая «агітацыя», якая заключалася ў пагрозах і рэпрэсіях у адносінах тых, хто не хацеў ісці галасаваць за фашыстаў. Орган ППС «Тыгоднік роботніка» на сваіх старонках прыводзіў наступны прыклад фашысцкай перадвыбарчай агітацыі:

«У Гродзенскім павеце за некалькі дзён перад выбарамі зойт (валасны старшына) воласці Ожэчэ Лесевіч у супрэваджэнні аднаго з чыноўнікаў ездзіў па вёсках і наладжваў перадвыбарчыя мітынгі, на якія ніхто з сялян не прыходзіў. Талы ён узяў паліцэйскіх. А калі і гэта не дапамагло — заклікаў на дапамогу каменданта паліцэйскага ўчастка. Уся гэта кампанія прыехала ў вёску Старая Руда. Збіраць сход узялася паліцыя, пагражаючы аштрафаваць на 5 злотых тых, хто не прыйдзе. Сяляне, якім ужо надакучыла плаціць розныя штрафы, або ў выпадку няўплаты падпадаць арышту, прышлі на сход. Фашысцкі прамоўца пачаў наступным чынам «агітаваць» за сваіх кандыдатаў: «Вы бараны. Вас ужо хтосьці збунтаваў, і вы не хочаце прыйсці на сходы. Вы думаеце, што галасаваць не пойдзеце? Лічу вас комуністамі, а комуністы — гэта ворагі дзяржавы, для якіх няма месца ў Польшчы».

Як вядома, і падобныя пагрозы не дапамаглі. 70 проц. насельніцтва адмовілася прымаць удзел у выбарах, абвясціўшы ім байкот.

Зусім зразумела, што выбраныя такім чынам сейм і сенат карыстаюцца заслужанай нянавісцю народа. Няма такога схода ці мітынга рабочых, сялян, дзе-б ліку першых патрабаванняў не выстаўлялася: роспуск сейма фашысцкіх назначэнцаў і правядзенне новых дэмакратычных выбараў. У шматлікіх забастоўках пролетарыята, ва ўсеагульнай забастоўцы сялян народныя масы недвухсэнсна заявілі, што яны супроць фашысцкай канстытуцыі, таксама як супроць і салонфашысцкага ўрада.

Няма сумненняў, што на рост незадаволення прапоўных фашысцкім рэжымам голаду, тэрору і вайны і юрыдычна ўзаконіўшай гэты рэжым фашысцкай канстытуцыяй аказвае велізарнейшы ўплыў пранікаючая ў свядомасць мас праўда з вялікай Сталінскай Канстытуцыі. Выразныя і ясныя словы Канстытуцыі СССР, якія аллюстроўваюць ужо заваёваныя ажыццёўленыя перамогі сацыялізма на адной шостай зямнага шара, выклікаюць жывы водгук у асяроддзі прапоўных капіталістычных краін, у асяроддзі прапоўных фашысцкай Польшчы.

Вялікі дакумент сацыялізма — Сталінская Канстытуцыя — запальвае рабочых і прапоўных капіталістычных краін, тым ліку і прапоўных Польшчы, энтузіязмам, узнімае іх веру ва ўласныя сілы, дае ім упэўненасць у перамозе над пыгнятальнікамі.

Канстытуцыя СССР стала... «маральна-дапамогай і рэальнай палмогай для ўсіх тых, хто вядзе цяпер барацьбу супроць фашысцкага варварства».

А. САКАЛОЎСКІ.

Намеснік адказнага рэдактара
І. М. ОФЕНГЕЙМ.

АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАВЕЦТВА: Менск, Совецкая, 63. ТЭЛЕФОНЫ РЭДАКЦЫІ: рэдактара — 21-372; сакратарыята — 25-188, 20-830; аддзелаў: партыйнага — 21-353, совецкага будаўніцтва і гандлю — 22-412, прамысловага — 21-356, сельскагаспадарчага — 21-846, культуры — 23-955, мясцовай і замежнай інфармацыі — 23-189, аддзела пісем — 20-844, 21-399, 21-885, ілюстрацыйнага і стыльрэдактуры — 21-556, абмену — 21-845.

Уп. Галоўлітбела № К—3177. Друкарня «Звязды», Менск, Совецкая, 63. К., Л., Б.